Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 „ — 2 р. 70 к. • 6 „ — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрамі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрамі шыпрэт тэксту 1 р. — к. За радок капітэрамі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожай. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрадоўж. і чырвонаармейцы за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, ва ўсіх аддзяленьнях Белгаспасцтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 198 (2386) Серада, 29-га жніўня 1928 г.

УСІМ САВЕЦКІМ УСТАНОВАМ І ГРАМАДЗКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ БССР.

30-га сьнежня 1928 г. спаўняецца дзесяцігодзьдзе існаваньня Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі. Прэзыдыумам ЦВК БССР выдзелена спэцыяльная камісія для падрыхтоўкі сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя. Для камісіі зьяўляюцца вельмі карыснымі ўсялякія матар'ялы, якія маюць дачыненьне да пытаньня агалашэньня і ўзьнікненьня БССР.

Выходзячы з гэтага, камісія пры Прэзыдыуме ЦВК БССР па падрыхтоўцы сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР зьвяртаецца да ўсіх савецкіх устаноў і грамадзкіх арганізацый БССР з просьбай аб перадачы ў камісію ўсіх маючыхся ў іх матар'ялаў аб агалашэньні і ўзьнікненьні БССР.

Паказаныя матар'ялы належыць здаваць сэкратару камісіі тав. Лібману.

КАМІСІЯ ПРЫ ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ СЬВЯТКАВАНЬНЯ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ АГАЛАШЭНЬНЯ БССР.

Урад СССР не падтрымае імпэрыялісцкіх ілюзій.

АДМОВА САВЕЦКАГА ЎРАДУ АД ПРАЦЫ Ў ЖЭНЕЎСКАЙ КАМІСІІ АБ КАНТРОЛЮ НАД ВЫРАБАМ ЗБРОІ.

27-га жніўня часова выконваючы абавязкі Народнага Камісара па Замежных Справах Л. М. Літвінаў паслаў генэральнаму сэкратару Лігі Нацый Друмонду тэлеграму, у якой гаворыцца:

Наконт перададзенага савецкаму ўраду праз нямецкі ўрад запытаньня аб магчымасьці ўдзелу савецкіх прадстаўнікоў у 2-й сэсіі спэцыяльнае камісіі аб кантролі над вырабам зброі, маю гонар паведаміць наступнае: савецкая делегацыя падрыхтоўчае камісіі аб разброеньні ў свой час, каб сапраўды забясьпечыць спакой, падала праэкт поўнага ўсеагульнага разброеньня, які ў выпадку яго ажыцьцяўленьня прывёў-бы да поўнага зьнішчэньня вырабу зброі. Нажаль, падрыхтоўчая камісія адхіліла гэты праэкт. Пададзены сьледам за ім савецкай делегацыяй у тую-ж камісію праэкт частковага разброеньня падрыхтоўчай камісіяй нават не разглядаўся, а склік наступнае сэсіі камісіі, па прычынах невядомых нават яе ўдзельнікам, адкладаецца ўсё надалей і надалей.

Іншыя камісіі Лігі Нацый таксама ніякіх вынікаў у напрамку сапраўднага разброеньня не далі.

ГІ НАЦЫЙ І ЯЕ ОРГАНАЎ НІЧОГА НЯ ЗРОБЛЕНА І НЯ РОБІЦЦА ДЛЯ САПРАЎДНАГА ВЫРАШЭНЬНЯ ХОЦЬ-БЫ ЧАСТКОВАЕ ПРАБЛЕМЫ РАЗБРОЕНЬНЯ.

Увесь сэнс падзей, неабходныя інтарэсы ўсіх народаў патрабуюць у сучасны момант больш, чым калі-небудзь, напружаньня сіл да сапраўдных дасягненьняў у справе разброеньня, а, значыць, да папярэджаньня небясьпекі новых войн. Пры такім становішчы рэчаў, праца па так званаму кантролю над вырабам зброі можа толькі абманыць грамадзкую думку, ствараючы бачнасьць такое працы членаў Лігі Нацый на ажыцьцяўленьні разброеньня, якое на справе ня існуе.

Зусім відавочна, што цяжкое для народных мас ярмо мілітарызму ня можа быць палегчана, і справа міру ня можа быць хоць крыху пасунута наперад тымі ці іншымі вынікамі працы спэцыяльнае камісіі да тае пары, пакуль ня спыняцца сучасныя выпярэдніцтвы ўрадаў у павялічэньні ўзброеньняў і вырабу зброі. Такім парадкам, праца спэцыяльнае камісіі, не даючы ніякіх практычных вынікаў, МОЖА ТОЛЬКІ СТВАРЫЦЬ ІЛЮЗІІ, ЯКІЯ ЎТОЯЦЬ САПРАЎДНЫ СТАН ПЫТАНЬНЯ АБ РАЗБРОЕНЬНІ.

Савецкі ўрад, з прычыны ўсяго гэтага ня лічыць магчымым часіць удзел у спэцыяльнай ка-

Разам з тым, савецкі ўрад яшчэ раз выказвае гатоўнасьць узяць самы актыўны ўдзел у працы дзеля сапраўднага ажыцьцяўленьня справы разброеньня, а таксама ў выпрацоўцы міжнародных канвэнцый, якія выплывалі-б з задач сапраўднага разброеньня.

Тэрор проці рабочых Харватыі

ВЕНА. Югаслаўскі міністр юстыцыі Вуйчыч прапанаваў пракуратуры ўжываць закон аб „абароне дзяржавы" да ўсіх асоб, якія агітуюць у друку і на сходах проці адзінства дзяржавы і існуючага ўраду.

Загад мае на ўвазе галоўным чынам кіруемы рабочымі арганізацыямі Харватыі масавы рух проці італьянскае калёнізацыі. У арыштце дэпутата апазіцкага акруговага самакіраўніцтва ад рабоча-сялянскага блёку Балькаса бачаць пачатак новае хвалі ўрадавага тэрору.

НЯГОДНЫ СРОДАК ЗМАГАНЬНЯ З АПАЗІЦЫЯЙ.

ВЕНА, 27-8. Загрэбская газэта «Навіны» паведамляе, што ў суботу ў Загрэб прыехала 10 агентаў урадавае радыкальнае партыі, каб спрабаваць дасягнуць «довады» сувязі між лідэрамі харвацкае сялянскае партыі (партыя Радзіча) і Бэла Кунам. Агенты спрабуюць наладзіць сувязь з мясцовымі рабочымі, прапануючы ім буйныя сумы за стварэньне «матар'ялаў», якія павінны «давесьці», што загрэбскія камуністы выконваюць ролю пасрэднікаў між харвацкай сялянскай партыяй і Бэла Кунам.

Чвяцкі друк Загрэбу вельмі абуран гэтымі спробамі і заяўляе, што ўрадавым партыям патрэбны гэтыя „матар'ялы", каб кампрамэтаваць харвацкую апазіцыю ў вачох Заходняй Эўропы і апраўдаць ужываньне проці апазіцыі закону аб „абароне дзяржавы".

Да далейшых клясавых перамог.

ВЫНІКІ КАНФЭРЭНЦЫІ АНГЕЛЬСКАГА ПРАФРУХУ МЕНШАСЬЦІ.

ЛЁНДАН, 27-8. Канфэрэнцыя руху меншасьці зачынілася. На заключным пасяджэньні былі адзвагодна ўхвалены рэзалюцыі па пытаньні „аб міры ў прамысловасьці" і аб безпрацоўі. Рэзалюцыя на пытаньні „аб міры ў прамысловасьці" востра ганьбіць учынкі генэральнае рады і прапануе ёй распачаць шырокую дыскусію ў прафсаюзным друку і ў „Дэйлі Геральд" з тым, каб пасьля яе быў праведзен рэфэрэндум па гэтым пытаньні.

2-я рэзалюцыя падкрэсьлівае нячуваны рост беспрацоўя і сталы характар яго таксама як і нікчэмнасьць рэфармісцкіх «разьвіваньняў пытаньняў»; рэзалюцыя патрабуе праводзіць рашучую палітыку ў пытаньні аб беспрацоўі.

Кук і Мэкстон у лісьце да канфэрэнцыі падкрэсьліваюць, што спробы прыдушыць актыўныя элементы ў прафсаюзах ахвяраваны на няўдачу, і патрабуюць, каб канфэрэнцыя дамагалася ажыцьцяўленьня свайго патрабаваньня даць волю палітычных пераканаваньняў усім членам прафсаюзаў.

„ВЕЧНЫ МІР" ПАДПІСАН.

Агаворкі асобных урадаў да пакту не зьяўляюцца абавязковымі для іншых яго ўдзельнікаў. Гэта робіць абавязацельствы пакту нявыразнымі.

НАВАТ САМ КЕЛЁГ НЯ ВЕРЫЦЬ У МОЦ „СВАЙГО СТВАРЭНЬНЯ".

Штучная цэрамонія.

ПАРЫЖ, 27-VIII. Сёньня адбылося ўрачыстае падпісаньне пакту Келёга. Тэкст пакту, напісаны на францускай і ангельскай мовах, ляжаў на стале ў залі гадзін (будынак міністэрства замежных спраў). Кожны дэлегат карыстаўся для подпісу асадкаю, падараванаю Келёгу гаўрскім муніцыпалітэтам, і мачаў пяро ў гістарычны каламар, які служыў для падпісаньня першага ўгавору між Францыяй і Амэрыкай 150 гадоў назад. Горад і ўсе грамадзкія будынкі ілюмінаваны.

ФАЛЬШ ВА ЎРАЧЫСТАЙ ПРАМОВЕ БРЫЯНА.

ПАРЫЖ, 27-VIII. Водлуг паведамленьня агенцтва Гаваса адбылося падпісаньне пакту Келёга.

Перад падпісаньнем пакту Брыян сказаў прамову, у якой выказаў падзяку Келёгу, Чэмбэрлену і Штрэзэману, падкрэсьліўшы іх стараньні, лёйяльнасьць і адданасьць справе міру. «Гэтая падзея—заявіў Брыян,—устанаўлае ў гісторыі чалавецтва новую дату, якая ўпяршыню мае абсалютна ўсеагульны характар. Парыскі пакт можа і павінен быць сапраўдным угаворам згоды. Асобныя згоды, падпісаныя ў Лёкарно, маюць мэтай палітычна забясьпечыць спакой у пэўнай частцы Эўропы і яны могуць прэтэндаваць на той універсальны характар, які мае сучасны пакт». Далей Брыян усхваляваў дзейнасьць Лігі Нацый, «гэтае магутнае ўстановы, якая падтрымае пакт, даўшы яму свайго роду агульную перастрахоўку».

«Абвешчан мір,—гаворыць у канцы Брыян,—гэта ўжо шмат, але мір трэба ўжо арганізаваць. Выраішэньне сёлаю трэба замяніць выраішэньнямі юрыдычнымі. Гэта справа заўтрашняга дня».

Крок на месцы.

ПАРЫЖ, 27-VIII. Учора Штрэзэман наведаў Брыяна. Па пытаньні аб дачаснай эвакуацыі Рэйнскае вобласьці Брыян, як кажуць журналісты, зазначыў, што Францыя ня можа вырашаць пытаньня аб эвакуацыі Рэйнскае вобласьці, не ўвязаўшы яго з пытаньнем аб даўгох і рэпарацыях. Брыян падкрэсьліў, што апошнія пытаньні залежаць ад Злучаных Штатаў, чаму абмеркаваньне іх неабходна адкласьці да прэзыдэнцкіх выбараў у Злучаных Штатах і парляманцкіх выбараў у Англіі.

На абедзе, наладжаным Келёгам, Штрэзэман адсутнічаў з прычыны хваробы.

Келёга наведаў Пуанкарэ. Паведамляюць, што ў гутарцы было закранута пытаньне аб магчымасьці паскорыць склік падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні.

Пакт — безадказная паперка.

ЛЁНДАН, 27-VIII. «Сэндэй Таймс» друкуе артыкул Келёга, напісаны спэцыяльна для газэты.

Келёг, між іншым, піша: «Я не магу прэтэндаваць на тое, што ўгаворы аб арбітражы і заміраючай працэдуры і нават угаворы, якія проста забараняюць вайну, як сродак нацыянальнае палітыкі, даюць пэўную гарантыю проці тых канфліктаў між дзяржавамі, якія пэрыядычна ўзьнікалі з самага пачатку сусьветнае гісторыі».

«Я не такі сьляпы,—піша далей Келёг,—каб верыць, што надышоў час міру, але я веру, што сьвет зробіць буйны крок у напрамку да мірнага пагоджваньня міжнародных канфліктаў».

Скептычная ацэнка пакту ў Англіі.

ЛЁНДАН, 27-8. Большасьць газэт, абмяркоўвае падпісаньне пакту Келёга. Амаль ва ўсіх артыкулах гучыць скептычная нота. Орган рабочае партыі «Дэйлі Геральд» піша: «Асноваю, на якой падпісан угавор, зьяўляюцца агаворкі. Пакт, як ён ёсьць, зьяўляецца мірным угаворам, падпісаным з дазволу імпэрыялістаў. У ім шмат шчылін для вылазак. Калі ўсе гэтыя шчыліны не зачыніць, дык пакт застанецца толькі цікавым дакумантам».

Першыя вынікі самакрытыкі.

На пленуме ЦКК Усе КП(б).

Ёсьць яшчэ шмат прапон для шырокага разгортваньня самакрытыкі. Трэба біць па асобах, якія пад выглядам барацьбы з заганамі самакрытыкі спасяюцца з самою самакрытыкаю.

Абмен думкамі па дакладзе тав. Лебедзя.

МАСКВА, 27-8. У спрэчках па дакладзе Лебедзя на пленуме ЦКК УсеКП(б) якія цягнуліся амаль два дні, брала ўдзел каля 40 чалавек. Апрача членаў ЦКК выказаліся таксама прысутныя на пленуме прадстаўнікі розных гаспадарчых арганізацый.

Пераблытваньне лёзунгу самакрытыкі.

Водлуг слоў т. БАХЦІНА, некаторыя разумеюць самакрытыку так, што можна ўхіляцца ад працы. На асобных прадпрыёмствах зьявілася вытворчая дысцыпліна. У некаторых гаспадарцаў наглядаецца ўпадачны настрой. Гэта тлумачыцца часта тым, што іншы раз іх незаслужана востра крытыкуюць. Асабліва шмат дастаецца гаспадарцам ад газэт. У друку часта зьмяшчаецца непраўдзівы матар'ял. Наогул друк павінен з вялікаю адказнасьцю адносіцца да выкрываючага матар'ялу.

У апошні час,—гаворыць т. ДЭЙЧ,—паслаблена ўвага да вытворчых нарад, да сабекошту, да дысцыпліны працы і іншых вытворчых пытаньняў. Некаторая небясьпека ў тым, што тэхнічны пэрсанал прадпрыёмстваў, так сказаць, прыстасаваўся да самакрытыкі і дзе-ні-дзе паслабіў свой нагляд і адказнасьць за вытворчасьць.

Самакрытыка рабочых мас,—гаворыць т. ЛЯЖАВА,—арганізаваная самакрытыка—гэта зьявішча здаровае. Такую самакрытыку трэба адбіваць у прэсе на ўсе 100 проц. Але індывідуальныя выступленьні асобных выкрываценяў без кантролю, без праверкі—рэч небясьпечная. Такія матар'ялы можна зьмяшчаць у прэсе толькі ў тым выпадку, калі яны праверены рабочымі арганізацыямі.

Як на адну з перашкод да разьвіцьця самакрытыкі, тав. НАЗАРАЎ зазначае на адпор, які іншы раз наглядаецца з боку адміністрацыі ўстаноў (прадпрыёмстваў). Вінаваты ў гэтым вельмі часта ня столькі гаспадарцы - камуністы, колькі апарат, спэцыялісты, якія маюць ў гэтых адносінах не заўсёды становчы ўплыў. Да гэтага адпору самакрытыцы вельмі часта далучаюцца і прафэсыянальныя працаўнікі.

У рабочай масе, водлуг заявяньня шмат-каго з прамоўцаў, самакрытыка ня досыць разгорнута. Да гэтага становішча павінна быць прыцягнута пашая ўвага.

У чым мусіць быць цэнтр цяжару.

Зусім няправільна, на думку тав. ШАЦКІНА, падышлі да пытаньня тыя таварышы, якія згуртавалі галоўную ўвагу на заганах самакрытыкі. Цэнтр цяжару ў тым, што ёсьць яшчэ шмат перашкод для разгортваньня самакрытыкі. Па гэтай лініі трэба біць. Зразумела, небясьпекі заганаў ёсьць, проці іх трэба змагацца. Але большая небясьпека ў тым, што пад выглядам барацьбы з заганамі некаторыя змагаюцца проці слова самакрытыкі. Тав. Шацкі закрануў таксама пытаньне аб неабходнасьці абароны крытыкуючых.

Да гэтага моманту, на думку т. КАМІСАРАВА, адбывалася расчыстка шляху для здаровае творчае самакрытыкі. Раней крытыкавалі пераважна асоб, а ня тыя ці іншыя недахопы ў апараце, у вытворчасьці і г. д.

Ня трэба забываць,—кажа т. МАРОЗ,—што самакрытыка павінна праводзіцца ня толькі зьнізу ўверх, але і зьверху ўніз. Між тым, у нас ёсьць і падладжваньне пад самакрытыку з боку асобных кіруючых працаўнікоў («як я магу выступаць проці? мяне потым назавуць бюракратам»). Гэтае падладжваньне органы РСІ ў сваёй практычнай працы павінны зьнішчаць; яны павінны дамагчыся таго, каб таксама, як рабочы крытыкуе дырэктара,—дырэктар мог крытыкаваць майстра, майстар—рабочага і г. д.

Тав. ДЭСАЎ спыняецца коратка на першых выніках самакрытыкі ў ленінградзкай арганізацыі. Абсьледваньне 16-ці прадпрыёмстваў, якімі ахоплена больш 9.000 членаў партыі і 40.000 рабочых, паказала, што пытаньне аб самакрытыцы пастаўлена там ня кепска.

Некаторыя таварышы зазначылі на наглядаемы ў зьвязку з самакрытыкаю рост актыўнасьці і самадзейнасьці рабочае клясы. Між іншым, павысілася актыўнасьць рабочае моладзі. Цалкам апраўдала сябе камсамольская «лёгкая кавалерыя».

Асобныя таварышы адзначаюць, што на вёсцы зусім слаба праводзіцца самакрытыка. Між тым, ажыўленьне працы сельсаветаў і барацьба з усімі мясцовымі недахопамі немагчыма без разгорнутае на вёсцы самакрытыкі.

Самакрытыка і друк.

Выступіўшы з вялікаю прамоваю т. ЯРАСЛАЎСКІ зьвярнуў галоўную ўвагу на пытаньне аб далейшым разгортваньні самакрытыкі. Раней усяго трэба адзначыць,—кажа ён,—што самакрытыка разгорнута недастаткова. Дзе-не-дзе сустракаецца зажым і індыферэнтныя адносіны да самакрытыкі. Як відаць, ня ўсе яшчэ зразумелі задачы самакрытыкі. Адказваючы асобным таварышом, якія вельмі востра нападалі на друк, т. Яраслаўскі зазначыў, што нельга агульна ахайваць выкрываньні, якія зьмяшчае друк. Усім вядома вялізнае значэньне рабселькораўскага руху, які прынёс нам столькі карысьці. Зразумела, ня ўсе рабкоры добрыя, ёсьць і хлусы-рабкоры. Але гэта ня значыць, што трэба кожную заметку праверыць. Калі зрабіць так, дык рэдакцыям прышлося-б займацца толькі рассылкаю заметак у губРСІ на праверку. Гэта заняло-б шмат часу і, апрача таго, за час рассьледваньня апустошваўся-б зьмест і вострасьць заметкі.

Мы не заўсёды ўмеем,—гаворыць далей т. Яраслаўскі,—правільна падтрымліваць прапорцыю сьвету і цені; ня ўмеем апавядаць аб дасягненьнях. Трэба гэтаму навучыцца, бо, выкрываючы недахопы і ганьбячы нягодное, мы павінны ў той-жа час не забываць і аб дасягненьнях.

Вымушанае адступленьне.

Абмяркоўваючы афіцыйныя запросіны ўраду СССР далучыцца да пакту Келёга, перададзеныя 27-га жніўня пры французкага пасла Эрбэта, «Известия» пішуць:

Бязумоўна, гэты крок, як-бы ён ні зьяўляўся няпрымны для некаторых з ліку 15-ці «першых падпісаўшых», быў вымушан усімі водгукамі, якімі была сустрэчана заява савецкага ўраду, што пакт без СССР няўхільна будзе мець у сабе антысавецкае джала. Цэлы шэраг органаў эўрапейскага і амэрыканскага друку зазначыў, што бяз подпісу СССР пакт Келёга ня можа лічыцца афармленым дакумантам. Якім-бы прывабным ні здаваўся для некаторых удзельнікаў пакту малюнак фармальнае волі рук у адносінах наступальнае вайны проці СССР, усё-ж ініцыятарам пакту, як відаць, не заставалася іншага выхаду, як палічыцца з настроямі шырокіх колаў эўрапейскае і амэрыканскае грамадзкасьці і запрасіць СССР далучыцца да пакту.

Гэтага мала. Для таго, каб самыя запросіны да неадкладнага далучэньня маглі мець месца ў самы дзень падпісаньня пакту, яго ініцыятарам прышлося адступіць ад усіх нормаў, якія прадугледжаны ў самім дакуманце. Мы ўжо адзначылі, што параграф 3-ці пакту зьмяшчае пастанову аб далучэньні дзяржаў, якія ня ўдзельнічаюць у пачатковым падпісаньні, толькі пасьля таго, як пакт будзе ратыфікаваны 15-ю ўдзельнікамі і набудзе моц. Адгэтуль выходзіла, што першыя ўдзельнікі пакту маглі захавць волю наступальнае чыннасьці ў адносінах да тае ці іншае з дзяржаў, якія ня ўдзельнічалі ў цэрамоніі 27-га жніўня, у працягу якога-небудзь пэрыяду часу. Цяпер, як відаць, гэты парадак зьменен, і пакт набудзе моц у адзін і той-жа момант як для 15-ці падпісаўшых яго дзяржаў, так і для ўсіх тых, хто далучаецца да пакту з моманту яго падпісаньня і да моманту ратыфікацыі.

Належыць адзначыць, што ўчора ў Парыжы быў падпісан толькі асноўны тэкст пакту. Якраз гэты пакт і быў перададзен да ведама Савецкаму ўраду французскім паслом. Абедзьве гэтыя акалічнасьці сьведчаць, што ўсе агаворкі, зробленыя як французскім, так і ангельскім урадамі ў адносінах да пакту (таксама як, зразумела, і тыя агаворкі, якія можа зрабіць любая з дзяржаў, падпісваючых пакт), застануцца толькі для магчымае інтэрпрэтацыі пакту з боку таго яго ўдзельніка, які гэтыя агаворкі зробіць, ня маючы абавязковае моцы для ўсіх іншых удзельнікаў пакту.

Нельга не адзначыць, што такая пастаноўка пытаньня робіць абавязацельствы пакту вельмі расьцяжнымі і тым самым вельмі нявыразнымі. Жаданьне т. Літвінава атрымаць дадатковыя весткі, якія датычаць дакумантацыйнага боку пытаньня, сьведчыць, што ў гэтым пытаньні яшчэ ня ўсё выразна.

Вакол падзей у Кітаі.

КАНКУРЭНЦЫЯ МІЖ ГАМІНДАНАЎСКІМІ ГЕНЭРАЛАМІ.

ТОКІЁ, 27-8. Водлуг вестак „Дзі-Дзі", з афіцыйных крыніц паведамляюць аб падпісаньні згоды між Мукденам і Ен-Сі-шанам. Гэта нібы зьяўляецца прычынаю адезду Фын-Юй-сяна з Нанкіну.

Фын-Юй-сян, нібы, баіцца страціць свой уплыў на поўначы, бо яго выпярэджвае Ен-Сі-шан.

СПУЖАЛІСЯ АБУРЭНЬНЯ МАС.

ПЕКІН, 27-8. Водлуг загаду ЦК Гаміндану, адменен загад аб зачыненьні пекінскае федэрацыі працы і далучаемых да яе прафсаюзаў.

КРЫВАВЫ САЮЗЬНІК НАНКІНА.

ПЕКІН, 27-VIII. Водлуг паведамленьняў з Мукдэну, Чжан-Сюэ-Ляй вызваліў усіх арыштаваных пры Чжан-Цзо-Ліне, западозраных у сувязі з Гамінданам.

ЯПОНІЯ РУЙНУЕ ПАЎСТАЎШЫЯ ВЁСКІ.

ШАНХАЙ, 27-8. Фынюйсянаўскае агенцтва Тачун паведамляе, што японская вайсковая ўлада Кіно-чау абвесьціла аб намеры зруйнаваць вёскі ў ваколіцах гораду, бо яны сталі базаю для паўстанцкіх атрадаў сялянскае арганізацыі «вялікіх нажы».

Камуністычнае паўстаньне.

ШАНХАЙ, 27-8. Дастаўленага ў Нанчан войска не хапае для барацьбы з узброенымі атрадамі пад кіраўніцтвам камуністаў у правінцыі Цзянсі. Правінцыяльная ўлада патрабуе ад нанкінскага ўраду прысылкі новых вайсковых частак.

Пленум выканкому МОПР'у.

СОТНІ ТЫСЯЧ ЗАКАТАВАНЫХ У ВЫНІКУ ЧАНКАЙШЫСЦКАГА ПЕРАВАРОТУ.

МАСКВА, 27-8. Адчынілася чарговая сэсія пленуму выканкому МОПР'у. Прысутнічаюць прадстаўніні 44-х краёў і шмат чужаземных гасьцей. Побач з дэлегатамі ад усіх эўрапейскіх дзяржаў і краёў Паўночнае і Паўднёвае Амэрыкі, на пленуме шмат прадстаўнікоў ад калёніяльных і поўнакалёніяльных краёў: Новая Зэляндыя, Паўночная, Заходняя і Паўднёвая Афрыка, Кітай і інш.

Пасьля дакладу т. Таосавай аб міжнароднай працы МОПР і рацыянальных сэкцый ад часу 2-ое міжнароднае канфэрэнцыі (сакавік 1927 г.) і дакладу т. Шмідта выступіла звыш 20 прамоўцаў. Яны падкрэсьлівалі, што працоўныя Эўропы ня досыць інфармаваны аб сапраўдным характары белага тэрору імпэрыялістаў і аб разьмеры тых крывавых ахвяр, якія прыходзіцца несьці калёніяльным народам у сваёй нацыянальна-вызваленчай барацьбе.

Між іншым, дэлегат ад «кітайскага таварыства дапамогі ахвярам вызваленчае барацьбы (кітайскі МОПР) адзначыў, што ад часу здрадніцтва Чан-Кай-шы толькі ў 44-х правінцыях расстраляна і задушана 337.000 рэвалюцыйных рабочых і сялян.

Пленум ухваліў адозву да ўсіх палітычных вязьняў у краёх капіталу і разаслаў прывітальныя тэлеграмы адсутнаму старшыні выканкому МОПР т. Клары Цэткін, зьняволенаму ў парыскім астрозе намесьніку старшыні выканкому МОПР т. Марці, Барбюсу і Ланцуцкаму.

РЭФАРМІЗМ ЗАВАЯВАЎ ДАВЕР'Е КАПІТАЛІЗМУ.

СПРОБА ПЕРАСАДКІ МАНДЗІЗМУ НА ФРАНЦУСКУЮ ГЛЕБУ.

ПАРЫЖ, 26-8. На апошнім агульным сходзе акцыянэраў усходняе чыгункі адзін з членаў праўленьня выступіў з прамоваю аб неабходнасьці супрацоўніцтва з усеагульнаю канфэдэрацыяю працы. «Я ня хочу, пэны,—заявіў ён,—чытаць палітычную ноту на нашым сходзе, але вы ўсе ведаеце натугі ўсеагульнае канфэдэрацыі працы, якая адмовілася ад сваіх даваенных рэвалюцыйных формул і шукае, наадварот, супрацоўніцтва з намі. Можа такім спосабам, спрыяючы рэалізацыі яе праграмы, мы змаглі-б зьнішчыць частку неадаволенасьці, якое штурхае людзей у крайнія партыі. Іменна яны і зьяўляюцца ў сучасны момант найбольшаю небясьпекаю».

САПСАВАНАЯ ЎРАЧЫСТАСЬЦЬ ДЛЯ БУРЖУАЗЕІ

ПАРЫЖ, 26-8. У часе гонак парусьнікаў у Шавюс ненаторыя парусьнікі, належачыя рабочым спартыўным арганізацыям, узьнялі замест устаноўленага французкага трохкалёровага нацыянальнага сьцягу чырвоны сьцяг з намаляванымі сярпом і молатам. Прысутныя на гонках два прадстаўнікі марскога міністэрства зазвялі пратэст. Сьцягі былі зьнятыя, але праз некалькі хвілін узьняты былі зноў; пасьля гэтага прадстаўнікі марскога міністэрства дэманстратыўна пакінулі месца гонак.

„Цывілізацыя" калёній.

ПАРЫЖ, 26-8. У Базаблянку ўпяршыню былі пакараны сьмерцю гільётынаю два мараканцы, засуджаныя за забойства французкае сям'і Курку.

Газэты ў справаздачах аб гэтым пакараньні сьмерцю зазначаюць, што на прысутных пры гэтым некалькі тысяч тубыльцаў гільётына зрабіла надзвычайна жудасное ўражаньне. Газэты аднак дадаюць, што жахарства лічыць за лепшае расстрэл, «больш варты рыцарскага характару французаў».

Нямецкая буржуазея страціла веру ў Лігу Нацый.

БЭРЛІН, 27-8. Нямецкі друк адзначае прыцельскае спатканьне, наладжанае Штрэзэману ў Парыжы. Друк, які прытрымліваецца заходняе арыентацыі, з «Форвэртсам» на чале, вітае падарожжа Штрэзэмана, ацэньваючы яго, як падзею вялікага значэньня. Аднак, большая частка друку падкрэсьлівае супярэчнасьць між гэтымі прыязьні і фактычнаю стрыманасьцю Францыі.

Нямецкі друк выяўляе надзвычайную стрыманасьць у адносінах надыходзячае сэсіі Лігі Нацый і амаль не абгаворвае яе. «Дэйтшэ Альгемайнэ Цэйтунг» піша: „Ліга Нацый стаіць на паваротным пункце, з прычыны поўнае адмовы ад палітыкі разброеньня. Вядомы паўднёва-нямецкі генэрал нядаўна заявіў, што пасьля ваіцкіх пытаньне аб разброеньні можна лічыць нерэальным. Калі выявіцца, што Ліга Нацый ня зможа адхіліць прычыны, якія рана ці позна павінны прывесьці Эўропу да вайны, дык гэта ня можа застацца без вынікаў. Усё больш і больш вылуўляецца думка, што спакой можа быць умацаваны толькі погляднам Вэрсальскага ўгавору".

Праца кангрэсу КІМ'а.

МАСКВА. На кангрэс КІМ'у ўжо прыехала звыш 200 дэлегатаў. Прыехалі таксама прадстаўнікі юнацкае анты-фашысцкае лігі Францыі і чырвонага юнфронту Нямеччыны і Аўстрыі.

Арганізавана і распачала працу камісія па прапрацоўцы праграмы КІМ'у. Распачала працу канфэрэнцыя прыбыўшых на кангрэс дэлегацый камсамолу Лацінскае Амэрыкі.

Рабочыя ў партыю Леніна.

БАКУ, 27-VIII: Усяго па бакінскай арганізацыі пададзена 600 заяў ад рабочых аб уваходзе ў партыю. Падаюць заявы пераважна старыя кваліфікаваныя рабочыя з беспартыйнага актыву, камсамольцы і ўдзельнікі грамадзянскае вайны.

Стыхійны распад нямецкае сац.-дэм. партыі

Дзесятні ўчарайшых меншавікоў пераходзяць у кампартыю

БЭРЛІН, 26-8. Крызіс нямецкае сацыял-дэмакратычнае партыі набывае ўсё больш значны абхват.

Камуністычная „Ротэ Фанэ" агалашае ліст за подпісам звыш 60 ранейшых службовых асоб нямецкае сацыял-дэмакратычнае партыі і сацыялістычнага саюзу моладзі, якія часткаю выключаны з партыі і саюзу, а часткаю—дабрахвотна выйшлі з партыі і з саюзу. Аўтары лісту востра ганьбяць сацыял-імпэрыялісцкую палітыку сацыял-дэмакратаў. Усе яны заяўляюць аб сваім уваходзе ў нямецкую камуністычную партыю.

Адначасна ў акрузе Эрцгебірзе-Фохтлянд апошнімі днямі ў нямецкую камуністычную партыю ўступіла 97 новых членаў, пераважна ранейшыя сацыял-дэмакраты.

Цэлы шэраг новых прафсаюзных арганізацый выказаўся за ўсенароднае галасаваньне па пытаньні аб набудове браняносца.

Змаганьне нямецкае кампартыі з палітыкаю сацыял-мілітарыстаў.

ЛЁЗУНГ КАМПАРТЫІ ПАДХОПЛЕН САЦ.-ДЭМ. РАБОЧЫМІ.

БЭРЛІН, 24-8. Сход эсдэкаў у Лейпцызе ў ліку 1500 пастанавіў патрабаваць партыйнага кіраўніцтва і рашучага падтрыманьня руху на карысьць плебісцыту па пытаньні аб крэйсэры.

РАБОЧЫЯ ВЫХОДЗЯЦЬ З САЦ.-ДЭМ. ПАРТЫІ.

БЭРЛІН, 24-8. Пасьля ўпартае маўклівасьці «Форвэртс» павінен прызнаць наяўнасьць шэрагу выпадкаў выхаду з партыі асобных эсдэкаў, абураных пазыцыяй партыйнага кіраўніцтва.

„ФОРВЭРТС" Б'Е ТРЫВОГУ.

БЭРЛІН, 26-VIII. «Форвэртс» у перадавіцы прызнае, што нямецкая сацыял-дэмакратычная партыя пасьля 10-га жніўня (у гэты дзень рада міністраў пастанавіла распачаць набудову браняносца) «ня можа гаварыць аб адсутнасьці крызісу ўнутры партыі».

Водлуг слоў «Форвэртс», першая прычына крызісу ў тых фактычных цяжкасьцях, з якімі для кожнае партыі зьвязан пераход з апазіцыі ва ўрад. Другая прычына крызісу, на думку «Форвэртс», прынцыповага парадку. Партыя павінна канчаткова выраішыць, як ёй адносіцца да праблемы абароны краю. «Ці прытрымліваецца партыя,—піша «Форвэртс»,—пункту гледжаньня Бэбеля, Жореса, Эрфурдкае праграмы і францускіх сацыялістаў, якія ўхвалілі цалкам закон аб абароне краю, ці яна прытрымліваецца прынцыпу, водлуг якога сацыялісты, ня лічачыся з станам узброеньня іншых краёў, павінны выступаць за поўнае разброеньне ўласнага краю? Той, хто думае, што пастановы брусальскага кангрэсу 2-га Інтэрнацыяналу прадугледжваюць такое абавязацельства, памыляецца».

АБ УДЗЕЛЕ БССР ВА ЎСЕСАЮЗНЫХ І ЗАМЕЖНЫХ ВЫСТАЎКАХ*).

Працаўнікі УССР аказаліся больш практычнымі: у Кёльн былі камандыраваны тры таварышы (у тым ліку адзін мастак), якія на месцы добра папрацавалі і арганізавалі украінскі аддзел на славу. На месцы яны адразу ўбачылі, чаго не хапае, і дадаткова выпісалі непасрэдна па выстаўку. Мы-ж даведаліся аб прапажы ўсіх нашых экспанатаў ў той час, калі прайшла большая палова выставачнага сезону.

Сьпешная дасылкі новых экспанатаў ня вырашаюць становішча, бо фактычна для разьмяшчэньня новых экспанатаў трэба будзе здымаць нейкія іншыя, што, бядай, цяжка будзе тэхнічна выканаць.

Цяпер аб афармленьні выстаўкі. Да гэтага часу мы надта мала аддавалі ўвагі знадворнаму афармленьню нашых экспанатаў, у той час, як на выстаўках паказны бок адыгрывае вялікую ролю. Калі-ж мы хочам вывіць нацыянальны стыль, паказаць беларускасьць нашых экспанатаў, зьнадворны выгляд набывае яшчэ большую вагу. Перад нашымі мастакамі кожны раз будзе ўставаць цікавая праблема: даць агульнае афармленьне савецка-пралетарскага характару плюс нацыянальны стыль, асабліва на замежных выстаўках.

ЖАНЧЫНА І ПРЭСА: (Савецкі павільён на міжнар. выстаўцы ў Кёльне).

Напрыклад, на Кёльнскай выстаўцы друку савецкі павільён рэзка выдзяляецца ад усіх буржуазных іменна сваім савецкім, рабоча-пралетарскім стылем.

У той час, як усе іншыя выстаўкі хваляюць на шаблён, даюць у сэнсе мастацкага афармленьня тое, што яны давалі зесяць і дванаццаць год назад, бальшавікі прышлі сюды з сваім зусім новым стылем, якога яшчэ ня бачыла і не стварала ніводная эпоха. У той час, як у іх пануе голая бязьдэйная дэкарацыя ў выглядзе жывых кветак, раскошных габеленаў, фантанаў і г. д., у нас пралетарскія, рэвалюцыйныя, камуністычныя па ідэі і зьместу экспанаты апрануты ў суровыя і магутныя адзежы рабочае і сялянскае працы, даны ў дынамічнай форме творчага будаўнічага працэсу. Характэрна, што матар'ял, з якога зроблены нашы канструкцыі-мадэлі,—гэта жалеза, сталь і дрэва. Даволі ўвайсьці ў савецкі павільён і глянуць на трохпаверхавую жалезную фігуру рабочага, які трымае на падняцтых угору руках вялізную жалезную бэльку-рэйку—і вы адразу ўсім нутром адчуваеце ілюстрацыю напружанага пралетарскага будаўніцтва. Адна такая фігура дае тон усяму пакою выстаўкі. Вялізная фігура сялянкі, з паднятым у руцэ сярпом, з твару якой заместа вачэй, носу, вуснаў глядзяць на вас літары—словы Леніна: «кожная кухарка павінна ўмець кіраваць дзяржавай»—гэта таксама экспанат у нашым пралетарскім стылю, які яшчэ і ня сьпіцца буржуазным мастакам.

Пакідаючы ў баку тэарэтычныя спрэчкі аб мастацкасьці таго ці іншага савецкага экспанату, мы сьцьвярджаем адно: на замежных (на сваіх таксама!) выстаўках нашы экспанаты павінны мець пралетарскі характар, свой пралетарскі стыль.

Надпісы, лёзунгі павінны быць строга ўвязаны з агульнай ідэяй, якая дэманструецца экспанатамі. Часам адзін лёзунг тлумачыць агульны зьмест цэлага шэрагу экспанатаў. Бы сьвятло пражэктара падае на ідэю, якая хаваецца за слупкамі і лічбамі дыяграм, за ўзорамі розных прадметаў. Напрыклад, у Кёльне ў савецкім павільёне высока на белай сьцяне вялізнымі літарамі стаіць (па-нямецку): „Савецкая прэса стаіць на варце сацыялістычнага будаўніцтва". Гэты надпіс дае кожнаму гледачу ключ для разуменьня нашых экспанатаў аб прэсе.

Што да зразумеласьці экспанатаў, то нашы мастакі павінны імкнуцца да таго, каб мастацкае афармленьне не рабіла «гвалту над зьместам». Захапленьне канструктывізмам часта яшчэ цягне за сабой гэты гвалт. Высока мастацкі экспанат захапляе толькі мастакоў, знаўцаў гэтае справы, эстэтаў. Шырокія масы гледачоў ідуць міма, а мы-ж для іх ладзім выстаўкі, на іх робім стаўку.

Для выставак у нашым Саюзе, дзе вялікі процант гледачоў мяняецца, асаблівую вагу набываюць так званыя мадэлі. Асабліва, калі яны зроблены ўмелай рукой і адзоблены сьвятлавымі эфэктамі. Яшчэ лепш, калі часткі мадэлі рухаюцца. Гэты від экспанатаў карыстаецца найбольшым посьпехам, самы лёгкі для ўспрыйманьня і найлепей асядае ў памяці. Элементы прымітыву ў экспанаце мадэлі якраз адпавядаюць прымітыўнаму ўспрыйманьню шырокага масавага гледача. А гэта нам і патрэбна.

(Працяг будзе).

ІВ. ЦЬВІКЕВІЧ.

*) Гл. „Сав. Бел." № 197.

У сецях сігуранцы.

(Падзеі ў Румыніі).

Пасьля забароны кампартыі ў Румыніі і ўсіх блізкіх ёй рэвалюцыйных арганізацый—моладзі, спорту і інш., а таксама і рэвалюцыйнае прэсы, румынская алігархія пачала душыць легальныя ўнітарныя прафсаюзы. Яшчэ год таму назад пры Авэрэску і міністру працы Транка-Яшы быў выдадзен «выключны закон» супроць прафсаюзаў, якія зьяўляюцца адзінай легальнай клясавай рэвалюцыйнай арганізацыяй Румыніі. Усё больш яднаючы рабочыя масы, гэтыя прафсаюзы зьяўляюцца першым абаронцаю іх інтарэсаў; яны зараз настолькі выраслі, што ўтвараюць сур'ёзную перашкоду наступу румынскага капіталу.

Ужо год, як зачынены рабочыя клюбы ўнітарных прафсаюзаў у Бухарэсце, Кішынёве, Арадэа, Галаце і інш. мясцох. Маемасьць гэтых клюбаў канфіскавана, і рабочыя пазбаўлены сваіх прафсаюзных дамоў. Іх правадыры арыштаваны па падставе выключных законаў.

Арыштаваных прафсаюзных дзеячоў «сігуранца» (ахранка) сурова зьбівае і прымушае падпісваць загадзя прыгатаваныя паліцыяй пратаколы, каб мець на руках „дакументы і доказы» аб камуністычнай прапагандзе. Такія арышты асабліва зрабіліся частымі за апошні час. З канца сакавіка г. г. адбыліся масавыя арышты прафсаюзных дзеячоў ва ўсіх больш ці менш буйных цэнтрах. Нягледзячы на суровае зьбіваньне арыштаваных у сігуранцы, усё-ж не ўдалося сабраць пажаданага абвінавачвачага матар'ялу. Сярод зьбітых знаходзіўся стары прафсаюзны дзеяч 60-цігадовы Сімо Геза і сэкратар унітарных прафсаюзаў т. Тырсу-Мурэш.

У канцы сакавіка г. г. сігуранца—нібы выкрыла вялікую змову ў г. Арадэа (Трансільванія), адным з важнейшых індустрыяльных цэнтраў. Гэта было ўласна правакацыяй для таго, каб распачаць масавыя арышты перад кампаніяй прафсаюзаў пры адначаленьні калектыўных дагавораў рабочых.

Становішча рабочае клясы наогул нікчэмнае: большасьць рабочых атрымлівае ад 300 да 700 лей у тыдзень (лея—адна капейка) пры рабочым дні ад 12 да 16 гадзін. У некаторых галінах, як тэкстыльнай індустрыі, рабочыя заняты толькі 2-3 дні ў тыдзень. Дарагоўля рэчаў шырокага ўжываньня ў параўнаньні з 1916 годам павялічылася ў 49 раз, у той час, як зарплата павялічылася толькі ў 16-20 раз. 700-800 грам горшага гатунку хлеба каштуе 15 лей. Санітарная ўлада г. Клуі сьцьвярджае наплыў беспрацоўных, якія прадаюць сваю кроў. Так, напр., за май і чэрвень было куплена 500 літраў крыві ў беспрацоўных г. Клуі.

Затрыманыя ў Арадэа 130 прафсаюзных дзеячоў былі амаль усе сурова зьбіты сігуранцай. Многія з іх пакалечаны. З прычыны абураючых адносін 47 арыштаваных правялі галадоўку агульным тэрмінам 679 дзён. З прычыны гэтае галадоўкі, магутных пратэстаў рабочых мас, саюзу абаронцаў, блёку рабочых і сялян і інш. арганізацый урад быў прымушан вызваліць 94 чалавекі з ліку арыштаваных у Арадэа і Клуі, але ўсё-ж пакінуў у турме яшчэ 23 чалавекі.

Асобныя выдатныя прафсаюзныя дзеячы, як Стэфан Форыш, рэдактар вэнгерскага выданьня прафсаюзнае газэты „Віяца Мунічытопра", былі вызвалены толькі пасьля 35-дзённае галадоўкі. Яго здароў'е канчаткова падарвана. 6-га чэрвеня г. г. працэс супроць прафсаюзу Бухарэсту быў адкладзен ужо ў дзесяты раз.

У надыходзячым прасэсе, які будзе ў канцы верасьня г. г. у гор. Клуі, перад вайсковым трыбуналам VI корпусу прадстануць 130 рабочых г. Арадэа і Клуі, перадавыя дзеячы ўнітарных прафсаюзаў, рабоча-сялянскага блёку і легальных камітэтаў дапамогі ўнітарных прафсаюзаў. У іх асобе сігуранца абвінавачвае генэральны савет унітарных прафсаюзаў вобласьці паўночнага Ардэляу (Трансільванія), прафсаюзныя аб'яднаньні і патрабуе іх зьнішчэньня. Арыштаваных Віктара Арада, Грюнвальда і інш. абвінавачваюць за іх дзейнасьць у легальных камітэтах дапамогі, працу якіх рэдакцыйны друк, на чале з газэтай сігуранцы «Унівэрсул», спрабуюць прызнаць аднолькавай па ідэі з дзейнасьцю забароненага румынскім законам МОПР'ам.

Апошнія прасьледваньні сігуранцы выклікалі вялікае абурэньне на ўсіх заводах і фабрыках, дзе рабочыя абгаварваюць меры абароны супроць пагрозлівае ад 300 да 700 лей у тыдзень (лея—адна капейка) пры рабочым дні ад 12 да 16 гадзін. У некаторых галінах, як тэкстыльнай індустрыі, рабочыя заняты толькі 2-3 дні

М. Міхадеску.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Кантрактацыя пасеваў.

(Ветрынскі райён, Полацкай акругі).

Водлуг маючыхся вестак, у Ветрынскім крэдытовым таварыстве ў мінулы год ніякіх мер па кантрактацыі ня прымалася. Сёлета—справа крыху пасунулася наперад. Па райёну налічваецца 5936 гаспадарак, з якіх беднякоў 975, сераднякоў 5923 і кулакоў 18.

Усяго на кантрактацыю лёну і канюшыны 54 дагаворы, з якіх з беднякамі—19, з сераднякамі—30 і кулакамі—1. На канюшыну ўтвораны 4 дагаворы. Плошча зямлі пад кантрактацыю адведзена ў 43 дзесяціны.

Крэдытовым таварыствам адпушчана: на лён—1393 р. 58 кап. і на канюшыну 550 руб., прычым гэта сума адпушчана на кароткі тэрмін. Маюцца 2 дагаворы, утвораныя цэлымі селішчамі, якім адпушчана 350 руб. крэдыту. Шкода толькі, што крэдытовае таварыства слаба клапоціцца аб інвэнтару. Выдадзена на пракат 10 плугоў, 7 для сераднякоў і 3 для беднякоў. Выдадзены таксама 2 пружынныя бараны.

Дрэнна прасоўваецца кніга.

У г. Барысаве і ў Нова-Барысаве кнігі распаўсюджвае толькі Барысаўскае аддзяленьне Белдзяржвыдавецтва, якое дзеля гэтага мае адну краму ў горадзе і адну—у Нова-Барысаве.

Займаючы манапольнае становішча на рынку, аддзяленьне Белдзяржвыдавецтва павінна было-б, здаецца, шырока разгарнуць сваю працу, бо ў Барысаве попыт на кнігу не малы. Але Белдзяржвыдавецтва давяло Барысаўскае аддзяленьне да таго, што кожную кніжку прыходзіцца выпісваць з Менску ці з Масквы, або езьдзіць за ёй у іншыя гарады. Кніжныя навінкі амаль што ў Барысаў не нападаюць, а калі прыходзяць, дык звычайна тады, калі ўжо зацікаўленасьць да гэтае кнігі аднала, і кніга застаецца ляжаць бяз руху.

Праз Барысаўскае аддзяленьне няможна набыць кнігу па заказу. Так, напрыклад, Барысаўскі гарком КП(б)Б, рыхтуючыся да курсаў рабочых-прапагандыстаў, за месяц да пачатку курсаў падаў сьпіс кніг і задатак грошай з просьбай выпісаць гэтыя кнігі. Што-ж вышла? Былі прысланы такія рэчы, як навочныя прылады, а такія кнігі як «Исторический материализм» Бухарына, «Вопросы ленинизма» Сталіна і г. д. у Барысаў па сталаму заказу парткому ня былі высланы. Ні за якія грошы не дабудзеш у Барысаве часопісь «Вопросы шефства», рэзалюцыі XV зьезду партыі. Ніводнай кнігі, прысьвечанай II зьезду партыі, ліпеньскаму пленуму ЦК УсеКП(б) у барысаўскіх манапалістаў кніжнай справы Белдзяржвыдавецтва ня знойдзеш.

Калі пачынаюць гутарыць з загадчыкам аддзяленьня, ён адказвае: «Я выпісаў сваечасова, але Менск не прысылае» і нават дакументы пакажа, якія сьведчаць аб тым, што сапраўды патрэбныя кнігі выпісаны сваечасова.

Такое становішча з прасоўваньнем кнігі у такім вялікім рабочым асяродку далей цягнуцца ня можа.

Барысаў. **Р.**

Вынікі загатовак бягучага году.

Бабруйск, 20-8. Акруговы саюз спажывецкай кааперацыі падвёў папярэднія вынікі вынаўненьня загатовак за бягучы гаспадарчы год. Па буйных скурах было заданьне загатовіць 2946 штук, загатоўлена 3733 штукі; дробных скур па заданьню было 22000 шт., а загатоўлена 40450 шт. Валакна заместа 72 тон загатоўлена 20 тон; зярна замест 3800 тон—1564 і г. д. Па трап'ю заданьне загатовак перавышана на 50 проц.

Паход Барысаўскай піанэр-арганізацыі.

Барысаў, 24-VIII. 2-га верасьня ў дзень Мюду Барысаўскай піанэр-арганізацыяй супольна з ячэйкай ТДА-Авіяхіму арганізаваны будзе праводзіцца вялікі паход.

У гэтым паходзе будуць удзельнічаць да 300—350 піанэраў і ТДА-Авіяхіму.

Даўжыня паходу 22 гады.

Беднота здаволена землеўпарадкаваньнем.

Да гэтага часу сяляне вёскі Кукшавічы вельмі мучыліся дзякуючы цеснаце. Амаль кожны год здараліся пажары і нішчылі, руйнавалі многа гаспадарак.

Далей жыць так было немагчыма і сабраўшыся на сход, сяляне гэтай вясной рашылі перайсьці на пасёлкі. З былой вёскі, якая цягнулася на 2 вярсты, цяпер утворана 9 пасёлкаў.

Праца ўвесь час ідзе добра. Незаможнікі здаволены, бо ўся беднота амаль засталася на месцы, а калі і выяжджае, дык ёй аказваецца дапамога. Што-ж датычыцца больш заможных, дык яны ня вельмі здаволены. На апошнім сходзе, які адбыўся 21 жніўня, яны рабілі спробу сарваць землеўпарадкаваньне, але сустрэлі адпор з боку беднаты.

Койданаўскі райён, Меншчына.

Чаму заняпала прафсьвета.

ГОМЕЛЬ, 28-8. Прафсьвета ў Гомельшчыне знаходзіцца на задворках. Да пытаньня падрыхтоўкі рабочай моладзі назіраецца амаль поўная індыферэнтнасьць.

Школа дрэваапрацоўчнікаў, маючы выгадны зямельны вучастак з будынкамі вытворчага навучаньня, ня мае памяшканьня для тэарэтычных заняткаў. з гэтай прычыны школа перажывае ўсякія цяжкасьці.

Замест таго, каб адпусьціць адначасова 5-6 тысяч руб. для пабудаваньня дому пры майстэрнях, школу пераводзяць з аднаго памяшканьня ў другое.

Найбольш магутная прафшкола мэталёўцаў кожную дробяць адваёўвае з вялікай цяжкасьцю.

Арганізаваныя мастацка-прамысловыя курсы зачыніліся, бо выдзеленыя гарсаветам камісіі ні разу не сабраліся.

У в. Навасёлках, Менскай акругі, выбухнуў вялікі пажар. Згарэла 6 дамоў, 9 пунь і 7 хлявоў. Палярпела 13 гаспадароў; агульныя страты ад пажару—20000 руб. Прычыны пажару высьвятляюцца.

Рыхтуюцца да прызыву 1906 году.

ГОМЕЛЬ, 28-8. 5, 6 і 7 верасьня будзе адбывацца жэраб'ёўка прызыўнікоў 1906 г. нараджэньня. Жэраб'ёўка будзе праводзіцца завочна пры ўдзеле выбарчых ад прызыўнікоў сёлаў і вёсак. Кампанія па прадастаўленьні ільгот прызыўнікам скончана. Вынікі ільготнай кампаніі абвешчаны прызыўнікам. Зараз у прызыўных пунктах распачата праца па абслугоўваньню прызыўнікоў у дні жэраб'ёўкі і прызыву. Для вядзеньня агітацыйна-асьветнай працы сярод прызыўнікоў камсамол выдзеліў кадр працаўнікоў. На ўсіх прызыўных пунктах будуць арганізаваны часовыя чырвоныя куткі.

Сустракаем дэмабілізаваных чырвонаармейцаў.

Гомель, 25-УШ. Пачалася падрыхтоўчая праца да спатканьня дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. Кааперацыйныя арганізацыі арганізоўваюць на чыгуначных станцыях буфэты з прадуктамі па танных цэнах. Біржа працы вядзе вучот вольных пасад для запаўненьня імі дэмабілізаванымі. Выдзяляецца камісія дапамогі дэмабілізаваным.

Рыхтуемся да перавыбараў дэлегатак.

Магілеў, 22-УIII. Распачынаецца падрыхтоўка да перавыбараў дэлегацкіх жаночых сходаў.

Перш за ўсё трэба ўлічыць памылкі мінулага году, калі частка партячэек выявіла няўважлівыя адносіны да перавыбараў. Сёлета прапануецца абгаварыць гэта пытаньне на райённых нарадах сэкратароў ячэек, вылучыць для правядзеньня кампаніі найбольш падрыхтаваных працаўнікоў і г. д.

Намячаецца і пашырэньне сеткі дэлегацкіх сходаў. У прыватнасьці з'арганізаваць сходы ў савгасах і калгасах (у тым ліку ў яўрэйскіх калгасах) і польскія нацсходы ў тых мясцовасьцях, дзе маецца значная частка польскага насельніцтва (Шклоўскі, Бялыніцкі і Магілеўскі райёны). У Магілеве мяркуецца мець асобныя сходы хатніх работніц.

Праца дэлегатак-практыкантак будзе праверана і справаздача іх пастаўлены на агульных жаночых сходах.

Пасьля выпуску старых дэлегатак трэба намеціць формы далейшай з імі працы.

У мясцовай акруговай газэце праводзіцца агляд працы дэлегацкіх сходаў.

БУДЗЕМ ЛЯЧЫЦЬ СУХОТНІКАЎ.

Гомель, 28-8. Народным Камісарыятам сродкі на пабудову ў Гомелі больніцы для сухотнікаў. З новага бюджэтнага году ў Камарыне адчыняецца фэльчарскі пункт.

Гняздо спэкулянтаў і папоў.

Полацак, 28-УIII. У прадпрыёмствах і арганізацыях Полацкай акруговай дзіцячай камісіі выяўлен цэлы шэраг злоўжываньняў, скрыўленьня савецкай лініі, рэлігійная прапаганда і шмат інш.

Загадчыцай дзіцячым прыёмнікам зьяўляецца жонка папа Пакроўскага, якая даволі актыўна распаўсюджвала сярод дзяцей рэлігійныя забабоны. Некаторыя дзеці з дазволу загадчыцы Пакроўскай нават хадзілі ў царкву.

З дзяцьмі абыходзіліся вельмі жорстка. Калі адна дзяўчына, выхаванка дзіцячага дому, сваечасова не змагла прадставіць дакумант аб прычыне звальненьня яе са службы, то выхавальніца Швэдовіч паклікала міліцыянэра і выгнала дзяўчыну на вуліцу ў 2 г. ночы.

Ня лепш стаіць справа з гаспадарчымі органамі камісіі. На чале ўсіх 3 крам дзіцячай камісіі знаходзяцца былыя спэкулянты і гандляры. Напр., грам. Гольдзін ня член саюзу, пазбаўлен выбарчых правоў і мае тры ўласныя дамы. Калі Гольдзіна звольнілі і прыцягнулі да адказнасьці па 108 арт. Кр. Код., то справа была спынена, а суд прысудзіў Гольдзіну 360 р. за працу ў выхадныя дні. Калі акруговая дзіцячая камісія апрацэставала гэту пастанову перад Наркампрацы, то апошні пакінуў пратэст бяз увагі.

З боку загадчыка майстэрні Грандэля заўважаны злоўжываньні: падроб рахункаў, незапыходаваньне грашовых сум і г. д. Тавары Грандэль купляў у прыватніка і, наогул, рабіў, што хацеў.

2 пазыка індустрыялізацыі.

ПАПЯРЭДНЯЯ ПАДПІСКА ДАЛА 1½ МІЛІЁНА РУБ.

У ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ РЭАЛІЗАЦЫІ.

24-га жніўня пад старшынствам тав. Хацкевіча адбылося пасяджэньне Цэнтральнай Рэспубліканскай Камісіі садзейнічаньня рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі.

На пасяджэньні быў заслухан даклад Наркамфіну аб ходзе рэалізацыі пазыкі ў БССР. Згодна вестак на 20 жніўня, у БССР па папярэдняй падпісцы рэалізавана пазыкі на суму паўтара міліёнаў рублёў. Падпіска на пазыку праходзіць з вялікім уздымам. Рабочыя і служачыя, за нязначнымі выключэньнямі, падпісваюцца на суму ня менш месячнага акладу. Слаба параўнаўча праходзіць рэалізацыя сярод некаторых аддзяленьняў саюзаў мэдсанпрацы і працаўнікоў асьветы. Мясцовыя органы ўлады амаль яшчэ ня прыступілі да рэалізацыі пазыкі сярод сялянства на вёсцы, што зьяўляецца вялікім недахопам у агульнай працы.

Камісія прызнала, што тэмп рэалізацыі пазыкі найбольш пасьпяхова праходзіць сярод рабочых вытворчых саюзаў; сярод сялянства на вёсцы праца па рэалізацыі пазыкі амаль што не пачалася; пастаноўлена прапанаваць мясцовым камісіям садзейнічаньня ўзмацніць тэмп рэалізацыі пазыкі на вёсцы сярод сялянства; прасіць рэдакцыі цэнтральных беларускіх газэт у матар'ялах аб пазыцы рабіць выпярэдніцтвы паміж паасобнымі ўстановамі, акругамі, райёнамі і г. д., а таксама ў парадку крытыкі і самакрытыкі асьвятляць дзейнасьць савецкіх і грамадзкіх органаў.

Заслухан таксама даклад ВСНГ аб ужытых ім мерапрыёмствах па дапамозе рэалізацыі пазыкі.

Цэнтральная Камісія прызнала, што ВСНГ, як орган, які ў першую чаргу зацікаўлен у індустрыялізацыі краіны, прыняў недастатковыя меры дапамогі рэалізацыі пазыкі. Камісія запрапанавала ВСНГ зрабіць загады трэстам аб садзейнічаньні прафорганам у справе рэалізацыі пазыкі. Асабліва павінны быць зьвернуты ўвага Лесбелу і Асінабуду на дапамогу ў разьмяшчэньні пазыкі сярод сялянства.

На наступным пасяджэньні Цэнтральнай Камісіі, якое адбудзецца 31-га жніўня, будуць заслуханы даклады НКЗемляробства, НК Асьветы і упаўнаважанага НК Шляхоў Зносін аб ужытых імі мерапрыёмствах дапамогі рэалізацыі пазыкі.

Меншчына рэалізавала на 1.066.785 руб.

Водлуг даных Менскага Акрфа, да 25 жніўня па гораду Менску сабрана падпіскі на 2-ую пазыку індустрыялізацыі на 801.785 руб., што складае 94,2 проц. заданьня. Тут трэба дадаць, што весткі па саюзах хэмікаў, працасьветы і «рабісу»—толькі на 20 жніўня. Наогул, сума падпіскі на 28 жніўня павінна быць большай.

Па гораду Барысаву падпіска на пазыку дала ўжо 165.000 р. Такім чынам, Барысаў выканаў сваё заданьне на 100 проц.

Па вестках з райёнаў акругі, да слова сказаць, яшчэ далёка няпоўных, сабрана падпіскі на 100.000 р.

Усяго-ж па акрузе рэалізавана пазыкі прыблізна на суму 1.066.785 р.; такім чынам, агульнае заданьне выканана ўжо на 79 проц.

ВЁСКА АСТРАВЫ ДАЛА 1.500 РУБ.

На агульным сходзе сяляне вёскі Астравы, Самахвалавіцкага райёну, падпісаліся на 2-ю пазыку індустрыялізацыі па 5 руб. усе прысутныя. За 3 дні падпіска дала 1500 руб. Лёзунг—«Ніводнага селяніна без пазыкі»—будзе ажыцьцёўлен.

РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ Ў ГОМЕЛЬШЧЫНЕ.

Падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі павялічваецца. На 27 жніўня сума папярэдняй падпіскі складала 500 тысяч рублёў. Рабочыя фабрыкі Шапіра і Кофман падпісаліся па 400 рублёў.

На фабрыцы «Везувий» сума падпіскі на 27 жніўня складала 33 тысячы руб. На заводзе «Пралетары» на 25 жніўня—25 тысяч руб. Адстае ў дадатковай падпісцы завод «Двигатель Революции».

На электрастанцыі рабочыя цель «Пралетары»—11.000 руб., арцелі мэталёўцаў—7600 руб., бойні—2600 руб., Палесдруку—9000 руб. У калектывах падпіска таксама праходзіць здавальняюча. Калектыў Палессельсаюзу падпісаўся на 7600 руб., Акрфін аддзелу—6245 руб., Акрземаддзелу—4465 руб. Слаба толькі праходзіць падпіска ў калектыве сельска-гаспадарчага банку. У банку ня ўсе супрацоўнікі падпісаліся на пазыку.

Па саюзу сельска-гаспадарчых рабочых падпіска на пазыку праходзіць досыць слаба.

Рабачкомы мала аддаюць увагі пазыцы. Усе абежнікі аб справы. Рабочыя, працуючыя у вёсцы не знаёмы з умовамі куплі пазыкі. Асабліва слаба працуе рабачком Борхаўскага лясьніцтва.

СЯЛЯНЕ ПАДПІСВАЮЦЦА.

БАРЫСАЎ, 24-8. За апошнія два дні сяляне вёскі Забашэвічы падпісаліся на 2 пазыку індустрыялізацыі яшчэ на 500 рублёў. Сяляне вёскі Глівіна пакуль-што падпісаліся на 150 рублёў.

Ужо падпісаліся на 125.000 руб.

ВОРША, 27, УШ. (Уласны кар.). На цьвікава-драцяным заводзе «Чырвоны Кастрычнік» падпіска на пазыку індустрыялізацыі ў поўным разгары. Агульная сума пазыкі—12.500 руб. Старшыня фабзавкому—рабочы, ён-жа і сябра ЦВК БССР—Паборцаў падпісаўся на 300 руб. і выклікае ўсіх сяброў ЦВК, АВК, РВК і сяброў с.-с.

Настаўніцтва не адстае.

ВОРША, 28-8. 20 настаўнікаў Аршанслага раймясцкому падпісаліся на 2-ую пазыку індустрыялізацыі на суму 1430 р. У сярэднім кожны настаўнік падпісаўся на 150 проц. месячнага акладу.

САМАТУЖНІКІ НЕ АДСТАЮЦЬ.

Папярэдняя падпіска на 2-ю пазыку Індустрыялізацыі сярод саматужнікаў праходзіць з вялікім посьпехам. Так, кравецкая арцель „Пралетары" ў ліку 123 ч. падпісалася на 9.600 руб., загатовачная арцель „Труд" у ліку 26 чал. падпісалася на 3.225 руб. і кравецкая арцель «Чырвоны Кастрычнік»—на 6.225 руб.

ІНВАЛІДЫ—НА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ.

Пасьпешна праходзіць падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі сярод інвалідаў. Так, інвалідная арцель № 5 падпісалася на 8.950 руб., а месячны іх аклад раўняецца 7.675 руб. У інвалідзкай арцелі «Прамені» падпісаліся ўсе рабочыя ў ліку 11 чал. на 720 руб. Падпіска працягваецца.

Некаторыя заўвагі да праэкту сыстэмы народнае асьветы БССР.

Праэкт сыстэмы народнае асьветы БССР ужо досыць доўгі час дыскусіруецца шырокаю савецкаю грамадзкасьцю і зараз стаіць у павестцы дню на наступнай сэсіі ЦВК для канчатковага вырашэньня і зацьверджаньня.

Вынікі дыскусіі падведзены. Супярэчнасьці і разыходжаньні, якіх і трэба было чакаць, вельмі значныя.

Пры хоць-бы больш-менш сур'ёзным крытычным аналізе праэкту, уся гэта надворна прыгожая і простая архітэктоніка, якую награфіў тав. Баліцкі, мае надзвычайна шмат недахопаў па сваёй, маючай быць, унутранай сутнасьці.

Перш, чым перайсьці да заўваг па паасобных частках сыстэмы, трэба зрабіць некалькі агульных заўваг: 1. Працаўнікі Наркамасьветы, калі хто-небудзь у спрэчках закранае пытаньне эканамічнае магчымасьці правядзеньня гэтае сыстэмы, альбо пытаньне праграм, ці абсталяваньня навучальных устаноў, заўсёды горача адказваюць, што, мол, гэта не датычыцца сыстамы, а сеткі. Яно фармальна можа і так, але-ж мы жывём у адпаведных эканамічных умовах і таму два галоўных пытаньні, а іменна: падняцьце культурнага ўзроўню насельніцтва і падрыхтоўкі патрэбных дзеля нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва кадраў мы павінны ўвязаць з нашымі матар'яльнымі, бюджэтнымі магчымасьцямі. Чаго гэта патрабуе? Гэта патрабуе, каб сетка наша была такая, якая выпушчала-б адпаведную колькасьць патрэбных кадраў, а калі гэта так, дык сыстэма павінна быць такой, якая магла-б быць забясьпечана грашовымі сродкамі.

Таму сыстэма, сетка, праграмы і абсталяваньне навучальных устаноў павінны быць шчыльна паміж сабою ўвязаны. Кожнае мерапрыёмства, не абгрунтаванае з грашовага боку, траціць амаль што ўсякую вартасьць. 2. Як адзін з найвялікшых структурных недахопаў праэкту, гэта—адсутнасьць дыферэнцыяцыі асьветы па паасобных галінах нашае гаспадаркі і культуры. Па праэкту выходзіць усё вельмі проста: пачынаецца ніжэйшая асьвета, потым сярэдняя, потым вышэйшая і, урэшце, праходзячы праз Інбелкульт «кожны грамадзянін БССР становіцца акадэмікам».

Ня ўсё тое добра, што проста. Складанасьць нашае гаспадаркі, розныя галіны яе патрабуюць і складанае сыстэмы для падрыхтоўкі кадраў па абслугоўваньню гаспадаркі. Мы ня можам, структурна аднолькова, будаваць сыстэму асьветы па сельскай гаспадарцы, фабрычна-заводзкай вытворчасьці і гуманітарных навуках, як гэта зроблена ў т. Баліцкага.

3. Паколькі сучасныя нашы ўмовы не даюць нам магчымасьці пабудаваць палітэхнічную школу (каб гэта магчымасьць была, дык мы столькі не спрачаліся-б па сыстэме), мы павінны сыстэму пабудаваць так, каб па-першаму—даць насельніцтву агульную асьвету з паступовым набліжэньнём да палітэхнізму, гэтую асьвету павінен мець, у абавязковым парадку, кожны грамадзянін, і па-другому—даць патрэбную колькасьць падрыхтаваных кадраў для абслугоўваньня нашае гаспадаркі.

Грунтуючыся на паказаных вышэй агульных заўвагах, я прапаную ўнесьці наступныя зьмены ў праэкт сыстэмы:

1. АГУЛЬНАЯ АСЬВЕТА.

Замест славеснае, схалястычнае семігадовае школы пабудаваць васьмігадовую школу, у горадзе з фабрычна-заводзкім, альбо муніцыпальным ухілам, у сяле—з сельска-гаспадарчым ухілам, і назваць іх: фабрычна-заводзкімі, муніцыпальнымі, сельска-гаспадарчымі, 8-мі гадовымі працоўнымі школамі. У такіх школах з другога канцэнтру, г. з. з 5-е клясы, увесьці працоўныя дысцыпліны, даваць вучням працоўныя навыкі. Што мы гэтым дасягаем: па-першаму, мы адмаўляемся ад сучаснае 7-мігадовае школы, дрэннага сурагату былушае старое гімназіі, па-другому—набліжаем школу да палітэхнізму, і па-трэцьяму—выпушчаем са школы вучняў больш-менш падрыхтаваных да працоўнага жыцьця. Бо мы добра ведаем, што ўсіх кончыўшых агульную 7-мі ці 8-мігадовую школу мы ня зможам вучыць у прафэсыянальна-тэхнічных навучальных установах, а нашы 7-мігодкі зараз выпушчаюць людзей абсалютна не падрыхтаваных да працоўнага жыцьця.

Чаму я прапаную 8-мігадовую школу? Па-першаму, таму, што ўводзяцца працоўныя працэсы, а па-другому, таму, што наша 7-мігадовая школа, з надзвычайна шырокай праграмай, перагружае працай вучняў, асабліва ў школах нацменшасьцяў, у якіх вывучаюць аж 4 мовы. Апрача ўсяго даведзенага вышэй, мы арганізацыяй 8-мі гадовае працоўнае школы вырашаем пытаньне школ сялянскай моладзі, якія ў сыстэме т. Баліцкага прышыты белымі і надзвычайна ценкімі ніткамі.

2. ПРАФЭСЫЯНАЛЬНАЯ АСЬВЕТА.

1) Прафтэхнічная школа: некаторыя таварышы хочуць давесьці, што ў нашых беларускіх умовах нам наогул непатрэбна прафтэхшкола. Яны абгрунтоўваюць гэта тым, што пасьля сканчэньня 8-мігадовае працоўнае школы чалавек ужо будзе досыць кваліфікаваным рабочым, альбо селянінам, і яшчэ таму, што трэба больш пашыраць фабзаববучы, прафшколы будаваць толькі ў выключных выпадках па некаторых спэцыяльнасьцях, ня ўводзячы іх у сыстэму. З такім пунктам гледжаньня згадзіцца ніяк нельга таму, што 8-мігадовая працоўная школа ня дасьць досыць добрага кваліфікаванага працаўніка, гэта па-першаму, і па-другому—фабзавучы мы можам арганізоўваць толькі на буйных прадпрыёмствах. Паколькі ў нас у БССР пераважна дробная прамысловасьць, дык нам, бязумоўна, неабходна ня толькі не адмаўляцца ад прафшкол, а наадварот—больш іх арганізоўваць, надаючы гэтым школам больш масавы характар. (Да рэчы хачу сказаць, што прафшкола павінна будавацца на базе 8-мігодкі). Па гэтаму пытаньні з праэктам я ня згодзен вось чаму: праэктам прадугледжваецца, што прафшкола павінна быць з 3-хгадовым курсам навучаньня, пры чым, прыкладна, 50 проц. ці 1½ гады павінна пайсьці на спэцыяльную адукацыю, а 50 проц. на агульную, і агульная адукацыя павінна даваць магчымасьць паступленьня ў ВНУ. Памоему, прафшкола павінна даваць толькі спэцыяльную адукацыю без агульных дысцыплін, бо вусім дастатковы аб'ём ведаў дае 8-мігадовая школа, каб стаць культурным рабочым ці селянінам. Выходзячы з гэтага, прафшколу трэба будаваць з адным—паўтара гадовым курсам навучаньня.

Паралельна з прафшколай, праэкт прадугледжвае спэцпрафклясы. Памоему, гэта зьвяно асьветы абсалютна непатрэбна і нават шкодна, бо праз прафклясы могуць прасякаць у ВНУ непажаданыя дзеля нас

Праверка--самакрытыка--кантроль мас.

1369 РУБ.—НА МЭБЛЮ АСАБІСТАГА КАРЫСТАНЬНЯ.

Хто гэтаму паверыў-бы, што для белканторы Прамбанку патрэбны былі ложкі, канапы, люстравыя шафы ды іншыя дарагія рэчы. Вер, ня вер, а факт застаецца фактам: б. кіраўнік Прамбанку Дзюніна для „сваёй" канторы купіў такую „абстаноўку" на суму 1369 р. 40 к. Гэта мэбля куплена, як быццам, для канторы, а ёю цалкам асабіста карысталіся кіраўнік Прамбанку і яго намесьнік.

У часе ліквідацыі белканторы прамбанку частка мэблі, на суму 297 р., была прададзена б. кіраўніку белканторы Прамбанку Цукерману, з пагашэньнем амартызацыйных налічэньняў (44 руб.) за лік установы. Большая частка мэблі (на 896 р.) зараз знаходзіцца ў асабістым карыстаньні кіраўніка прамбанку Кэстэра. Амартызацыйныя налічэньні на гэту мэблю таксама праводзяцца за лік установы.

Акрамя мэблі, кіраўнік Прамбанку асьмеліўся страціць 2000 руб. на радыё-устаноўку. Гэта сума была скрыта—няправільна праведзена па кнігах, а частка маемасьці (ванна і інш.) зусім ня лічацца ў інвэнтарнай кнізе.

Народны Камісарыят РСІ сказаў сваё слова:

Справа аб безгаспадарчай дзейнасьці б. кіраўніка Прамбанку Дзюніна перададзена ў парткалегію ЦКК КП(б)Б для прыцягненьня да адказнасьці.

Прапанова дзяржбанку—сыскаць з Дзюніна, Цукермана і Кэстэра амартызацыйныя налічэньні за карыстаньне мэбляй, а таксама ліквідаваць усю непатрэбную мэблю.

З.

„РАЦЫЯНАЛІЗУЕМ", „КАМБІНУЕМ".

Усе і ўсюды рацыяналізуюць апарат, скарачаюць адміністрацыйныя выдаткі, прыводзяць у спраўнасьць саветскія ўстановы і прадпрыемствы. А вось Аршанскі камунальны трэст робіць рацыяналізацыю навыварат.

Пасьля прыходу ў камтрэст новага загадчыка, гр. Сьліўкіна, невядома з якой прычыны, ня гледзячы на тое, што праца не павялічылася, штат камтрэсту ўзрос на 30 проц., што каштавала камтрэсту добрую капеечку.

Сьліўкін назьбіраў да сябе ўсіх сваіх знаёмых, навыклікаў з Менску спэцыялістаў і г. д. Калі мясцовыя працавалі за 125 руб. у месяц, дык Сьліўкін менскім сваім «спэцам» дае 200 руб. і нават яшчэ надзёмных, колькі «полагается».

Адзін са «спэцаў», працуючы ў камтрэсьце, павёў справу так, што хутка ўцёк зноў у Менск, бо... пагражала.

Каб падагнаць усё тое, што трэба было зрабіць 7-8 месяцаў таму назад, цяпер працуюць звыштэрмінова, для чаго ўзялі яшчэ лішняга чалавека. І вось звыштэрміновыя плюс аплата, па «усмотрению» Сьліўкіна «спэцам»—зьвялі шмат дзяржаўных грошай.

Падобныя-ж справы пачалі «наладжвацца» і ў гарсавеце.

Пры Аршанскім камгасе арганізуецца камбінат з аднаго млына і 4 аўтабусаў, з якіх два паламаны,—рамантуюцца.

Для вядзеньня спраў камбінату трэба было-б узяць толькі аднаго рахункавода, але па «усмотрению» начальства бярэцца спэц—загадчык і бухгальтар. На пасаду загадчыка ў Воршы не знаходзяць чалавека і па рэкамандацыі выклікаюць з Менску нейкага «спэца» Штэркеля.

Штэркель пры дапамозе гарсавету і камгасу праведзен праз Біржу Працы, як выдатны спэц, а потым праводзіцца і ў штат з акладам 100 руб. у месяц.

Новая «камбінаваная» ўстанова з млына і аўтабусаў каштуе камгасу каля 250 руб. у месяц.

Дзе яшчэ ўмеюць так камбінаваць?

С.

8-ы ГОД ЦЯГНУЦЬ СПРАВУ.

У 1920 годзе гр-ка Бакун Прузына засталася сіратой. Карыстаючыся гэтым, нейкія невядомыя Бакуны „аднафамільцы" захапілі зямлю гэтай сіраты ў колькасьці 3 дзесяцін у сваё карыстаньне. У той час сірата ня ведала, што рабіць, але выхаваўцы яе сталі абаронцамі беднай дзяўчынкі.

Справа аб захопе зямлі была пададзена ў суд, які сваёй пастановай запрапанаваў тэрмінова перадаць зямлю сіраце. 13 красавіка г. г. Менакрэмкамісія накіроўвае справу Барысаўскай райзямкамісіі для выкананьня.

Здавалася-б, нашто яшчэ цеганіна—усё ў парадку, і сірата хоць у 28 годзе атрымае сваю зямлю. Але вышла ня так. Барысаўскія „працаўнікі" ўмудрыліся справу наладзіць зусім інакш: 12 чэрвеня г. г. райзямкамісія накіравала ўсю справу ў пейкі Перасадзкі сельсавет для выкананьня, дзе яна „выконваецца" і да гэтага часу.

А. Станкевіч.

Барысаў.

Тысячы рублёў на вецер.

10000 руб. было адпушчана дзяржавай для будаўніцтва школы ў Дубровенскім р-не. Меркавалася, што школа будзе абслугоўваць тры вёскі: Баброва, Загвоздзіна і Юр'єва і савгас Халоўе. Работа закіпела. З кожным днём будаўніцтва ішло ўперад. Заложаны былі: падмуркі, вырасьлі сьцены. Але раптам ні з таго, ні з сяго ўся гармонія абарвалася, праца прыпынілася.

Пасьля аказалася, што грошы настаўнік Маісеенкаў растраціў, а матар'ял раздаў. Якая была бляха, пашла на самагонныя катлы, бярвеньні—на хаты сваякам, дошкі—на карыдоры, на масты, толькі не на школьныя. Райённае начальства спахвацілася: арыштавалі Маісеенкава. Гэта было ў 1926 г.

Школа-ж як была няскончана, так і засталася. Сьцены голыя стаяць пад дажджом, гніюць, апошні лесаматар'ял раскрадзен, дзеці вясковыя ў памяшканьні сядзяць. Забыліся на школу. Школа без гаспадара. Хто адратуе школу?

Рублёў Цім.

Ворша.

Ня турбуйце, ня дурыце галавы...

Не адзін раз старшыня Завішанскага с.-сав., Плешчаніцкага райёну, Мышчук разам з сакратаром ламалі каткі, адрывалі ад возу восі і калечылі коні, праяжджаючы прасёлачнымі дарогамі праз вёскі—Таратокі, Капаточка і Дзьвірас. У апошні час нават пехатой немагчыма было прайсьці па гэтых дарогах, прыходзілася абходзіць вёскі, даючы кругу на некалькі вёрст. Прасёлачныя дарогі ў райёне с.-с. не рамантаваліся, размываліся дажджамі, а мосьцікі разносіліся вадой.

Мышчук хоць гэта ўсё добра бачыў, але і вусам ня вёў. На сялянскіх сходах, калі ставілася пытаньне аб рамонтах дарог і мастоў, Мышчук заўсёды гаварыў: «Пачакайце, хлопцы, спыняцца дажджы, і дарогі напэўна направяцца».—Тымчасам дожджыкі пераходзілі, і дарогі яшчэ горш псаваліся.

У маі прадстаўнік РВК упэўніўся на месцы становішча дарог і 22 мая 1928 г. за № 2820 на імя Завішанскага с.-с. РВК была паслана адносіна з прапановай тэрмінова адрамантаваць дарогі і аб выкананьні паведаміць.

Атрымаўшы адносіну, Мышчук паклаў яе пад сукно, дзе яна ляжала месяц без усялякага руху.—Калі РВК напісаў Мышчуку другую прапанову пасьпяшацца наконт рамонту дарог, Мышчук 28 чэрвеня г. г. за № 345 напісаў РВК наступны адказ:

«Прашу ня турбаваць і ня дурыць галавы, а прысылаць грошы, тады я, нават жонка, дзеці і іншыя сяляне адразу пачнём шляхі, а пакуль грошы не атрымаю, з месца не крануся».

І сапраўды, Мышчук не клапаціўся і ня рухаўся з месца.

Невядома, што скажа на гэта РВК.

Д. Кастроў.

Чыё гэта галавацяпства?

Загатовіла Хоцімскае сельска-гаспадарчае таварыства (Магілеўшчына) цэлы вагон касьцей для экспарту.

Загатовілі і зварачваюцца ў бліжэйшы пункт, ці аддзяленьне Белдзяржгандлю...

— Так і так, калі ласка, прымеце і накіроўвайце куды трэба...

Здаецца, чаго-ж яшчэ. Але працаўнікі дзяржгандлю разважаюць інакш. Адпраўляйце, кажуць, самі, а нам няма ахвоты вазіцца з вашай сыравінай.

Вось што піша Аршанскае аддзяленьне свайму Касьцюковіцкаму агенцтву і ў копіі—Магілеўскаму акрсельсаюзу.

«... З атрыманьнем гэтага прапануецца вам тэрмінова даць Хацімскаму с-гасп. таварыству прызначэньне на адпраўку вагону паліўных касьцей праз Негарэлае ў Польшчу. Пры гэтым паведамляем, што прадпрыемствы таварыства і азнаёміць са ўсімі патрабуючымися пры гэтай адпраўцы фармальнасьцямі (взтвасьведчаньне асабістага зьместу на расейскай і польскай мовах, тамажанная дэкларацыя ў 3-х экземплярах, сэадпаведна заноўненая, спецыфікацыя за подпісамі адправіцеля). Папярэдзьце адправіцеля, што ў выпадку дрэннай якасьці касьцей, або пры невыкананьні ўсіх фармальнасьцяй, усе маглівыя страты будуць аднесены за рахунак адправіцеля". (Адносіна ад 3-8-28 г. за № 6317).

Вы ўяўляеце сабе, як гэта лёгка будзе выканаць усе гэтыя «фармальнасьці» працаўнікам нізавога с-гасп. таварыства. Але лепш пойдзем далей.

8 жніўня за № 6379 Магілеўскі Акрсельсаюз піша ў Белсельсаюз.

«...патрабаваньне ад нізоўкі адпраўленьня касьцей непасрэдна заграніцу і выкананьне ўсіх фармальнасьцяй прымусіць нас спыніць здачу касьцей Белдзяржгандлю і завязаць перагаворы на здачу іх іншым арганізацыям. Кожны раз, калі нізоўцы прыходзіцца здаваць тую ці іншую сыравіну пунктам Белдзяржгандлю, прыходзіцца ледзь ня 2 тыдні весьці перапіску, пакуль Аршанскае аддзяленьне, ці Касьцюковіцкі пункт «благоволят» прыняць сыравіну"...

Белсельсаюз, зразумела, аб гэтым у Наркамгандаль, а той, відаць, зноў па інстанцыях...

А косьці?

— Ды што-ж косьці, валяліся на палях неарганізавана, а зараз не ляжаць „крыху" арганізавана...

А між тым загатоўчы сэзон не за гарамі, і такія адносіны мясцовых органаў Белдзяржгандлю да прыёмкі сыравіны ад нізавой сеткі каапэрацыі змогуць адбіцца на яе загатоўчай здольнасьці.

Хто тут вінаваты, спадзяёмся, высьветліць наша Рабоча-Сялянская Інспэкцыя і закліча да парадку.

В. Зайцаў.

Міліцыя ўмяшалася не ў сваю справу.

(Чавускі р., Магілеўшчына).

Справа фізвыхаваньня за апошні год у нас значна пасунулася наперад. У працягу зімы існавалі ў Чавусах два гурткі, у якія былі ўцягнуты да 40 асоб моладзі—дзяўчат і хлапцоў. Было шмат спартыўных выступленьняў, якія мелі мэтай папулярызаваць фізычнае выхаваньне.

Платныя выступленьні ўтрымлівалі панятага інструктара, а з адпушчаных па бюджэце сродкаў сто рублёў было накіравана на папаўненьне спартыўнае залі розным інвэнтарам.

З надыходам вясны праца на вёсцы таксама разгарнулася і ў вёску накіравана 10 футбольных мячоў, закладзена 6 спартыўных гурткоў і праведзены курсы працаўнікоў апошніх. Гурткі працуюць рэгулярна і праводзяць шэраг выступленьняў, уцягваючы моладзь у карысную справу. Пры нардоме ў горадзе заснаваліся сэкцыі па розных відах спорту.

Наогул, моладзь уцягнулася ў гэту справу, і можна было б чакаць вельмі добрых вынікаў, каб райміліцыя не заняла памяшканьня спартыўнае залі. Яна зрабіла вельмі проста: зламала замок, выкінула ўвесь інвэнтар спорту і заняла памяшканьне пад кватэру міліцыянэраў. На другі дзень РСФК вылучыў камісію дзеля выяўленьня колькасьці страчанага інвэнтару. Аказалася, што часткі рэчаў не знайшлося, і спортгурток пазбавіўся базы ў сваёй працы. Ня варта і гаварыць, што падобныя ўчынкі зусім недапусьцімы ў адносінах да справы фізвыхаваньня.

Да гэтага часу невядома, ці міліцыя гэта самачынна зрабіла, ці па загаду мясцовае ўлады.

Так ці інакш, учынак не на карысьць справы.

А.

Адзіны ў БССР.

Ёсь у Новабеліцы лікавы завод Белдзяржсьпірту. Адзіная, можна сказаць, вытворчасьць у БССР. Уласьціва, гэта не завод, а лябараторыя вытворчага тыпу. Вытворчасьць рэнтабельная: дае штогод значны прыбытак, толькі часта бываюць перабоі ў дастаўцы сыравіны—смалы, якую прыходзіцца за валюту атрымліваць з-заграніцы. Завод паставіў перад сабой задачу вызваліцца ад капіталістычнай залежнасьці і рабіць вопыты здабываньня штучнай смалы з нашай сыравіны. Вопыты далі добрыя вынікі, і зараз ставіцца пытаньне аб здабываньні смалы ў больш шырокім маштабе. Такім чынам, рацыяналізацыя вытворчасьці, у сэнсе адшуканьня новых мэтадаў, паступова правільна.

Але атрыманая эканомія поўнасьцю ідзе на апарат. Разглядаючы апарат гэтага маленькага заводу-лябараторыі, кожны, нават ня надта сьвядомы ў пытаньні апаратнай рацыяналізацыі, са зьдзіўленьнем спытаецца: што гэта—злачынства, ці ў адміністрацыі Новабеліцкага заводу мазгі перавярнуліся?.

Толькі зьвярнеце ўвагу на гэты штат і на процантныя суадносіны атрымліваемай рабочымі і служачымі пэнсіі, а таксама на суму выдаткаў на ўтрыманьне тых і другіх.

— Рабочых на заводзе толькі 3 чал., — каротка адзначае Белдзярсьпірт у сваім паведамленьні ВСНГ 3-га ліпеня за № 10109. Атрымліваюць яны па 41 р. 25 кап., а разам у месяц—123 р. 75 к.

А вось букет служачых значна пышнейшы, як у колькасным складзе, так і па суме атрымліваемай імі пэнсіі. Іх усяго на заводзе 7 чалавек, г. зн., у два з лішнім разы больш, як рабочых. Сума ўтрыманьня іх складае 695 руб., ці амаль у пяць разоў больш кошту ўтрыманьня рабочых. Тут маюцца пасады розных назваў і рангаў, як гэта бывае ў прыватным прадпрыемстве: дырэктар з акладам 159 руб. (кажуць, нядаўна быў таксама і намесьнік яго) і майстар з акладам у 180 руб. і, як належыць на штату,—галоўны бухгальтар.

А як-жа з інструмэнтамі і матар'ялам? Траб-ж каб хто-небудзь выдаваў інструмэнты, сыравіну і ўсё іншае 3-м рабочым. І вось для выкананьня усіх гэтых «адказнейшых» з «складаных» функцый—устаноўлена спэцыяльная пасада загадчыка маемасьцю заводу з пэнсіяй 71 р. 89 к. у месяц.

Апроч усяго гэтага, ахову заводу, з адным выхадам і тэрыторыяй у далонь, нясуць 3 ч. Вартуюць савецкае дабро сумленна круглыя суткі, зьмяняючы адзін другога ў вызначаныя гадзіны, як гэта належыць па штату. Утрыманьне двох з іх каштуе 120 руб., а трэцяга, як відаць, пакрыўджанага лёсам і няздатнага да наношваньня зброі (варта ўзброена)—39 руб.

Але на гэтага трэцяга ўскладзены функцыі кур'ера.

Вось як вядзецца гаспадарка на адзіным у БССР дзяржаўным лікавым заводзе. Паспрабуйце пагаварыць з адміністрацыяй заводу пра дырэктывы па максімальнаму рэжыму эканоміі, зьніжэньню адміністрацыйных выдаткаў ці аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі, дык яны заўзята будуць вам даводзіць з лічбавымі данымі ў руках, што ўсе гэтыя дырэктывы яны выконваюць поўнасьцю.

Здаецца, быццам фармальна правільна, а па сутнасьці—зьдзек.

Для скарачэньня надзвычайна вялікага штату на заводзе прышлося ўмяшацца ВСНГБ, адвак Белдзяржсьпірт і заводакіраўніцтва пакуль што вядуць дыскусію аб тым, каму ахоўваць маемасьць заводу, а справа ўсё яшчэ не варушыцца з месца.

Сапраўды, рэжым эканоміі—дыбам.

Новабелецкі.

Што трэба ведаць плацельшчыкам падатку.

Многія сяляне, што працуюць на пабочных заработках, будаўнікі-сэзоньнікі пытаюцца: куды і як плаціць сельска-гаспадарчы падатак.

Сельска-гаспадарчы падатак можна ўносіць у свой райвыканком, у любую касу НКФ, у любое паштова-тэлеграфнае аддзяленьне і праз ашчадную касу (калі платнік зьяўляецца яе ўкладчыкам).

Каб унесьці падатак у свой райвыканком, трэба падаць туды свой акладны ліст. Па гэтаму акладному лісту павінны прыняць сельска-гаспадарчы падатак у любой суме, нават меншай, як паказана ў акладным лісьце (да тэрміну).

Падатак можна ўносіць і не самому, а праз старшыню сельскага савету, калі на яго райвыканкомам усклаўдзен гэты абавязак.

Калі падатак здаецца праз старшыню сельскага савету, які прымае падатак згодна пастановы райвыканкому, то адказнасьць за здачу гэтых сум нясе старшыня сельскага савету. Калі грошы ў райвыканком не пададуць, платнік не адказвае: ён лічыцца заплаціўшым сельска-гаспадарчы падатак у тэй частцы, якую здаў старшыні сельскага савету.

Хто знаходзіцца дзе-небудзь на заработках у горадзе, у іншай акрузе ці раёне, той можа заплаціць сельска-гаспадарчы падатак там, дзе ён працуе. Для гэтага трэба падаць туды акладны ліст і ўнесьці падатак. Далей ужо клапаціцца ня трэба. Каса павінна прыняць падатак, адзначыць у акладным лісьце аб аплаце і паведаміць аб гэтым райвыканком. Днём аплаты ў гэтым выпадку лічыцца дзень уносу падатку ў касу.

Укладчыкі касы ашчаднасьці лёгка могуць аплаціць сельска-гаспадарчы падатак праз яе. Для гэтага трэба падаць туды свой акладны ліст і ашчадную кніжку. Па гэтых дакумантах каса ашчаднасьці сьпіша в кніжці тую суму, якую платнік хоча заплаціць у лік сельска-гаспадарчага падатку, і выдасьць яму спэцыяльную квітанцыю. Гэта квітанцыя зьяўляецца дакумантам аб аплаце сельска-гаспадарчага падатку.

Найпрасьцей і выгадней усяго плаціць сельска-гаспадарчы падатак праз любую паштова-тэлеграфную ўстанову. Для гэтага ні акладнога ліста, ні якіх іншых дакумантаў ня трэба. Трэба толькі на полце запоўніць бланк пераводу з азначэньнем у ім, куды і каму пасылаюцца грошы, іншымі словамі, назваць той райвыканком, куды пасылаецца перавод і колькі грошай пасылаецца. За перавод сельска-гаспадарчага падатку выскваюцца з платніка грошы па ўстаноўленай такце і выдаецца звычайная паштовая расьпіска з азначэньнем у ёй, што яна выдадзена ў прыняцьці сельска-гаспадарчага падатку. Трэба мець на ўвазе, што гэтыя паштовыя расьпіскі адрозьніваюцца ад звычайных тым, што на іх ставіцца не адзін, а два паштовыя штампы: адзін на папярэднім баку, другі—на адваротным баку. Расьпіскі гэтыя зьяўляюцца дакумантам аб аплаце сельска-гаспадарчага падатку. Днём аплаты ў гэтым выпадку лічыцца дзень прыняцьця падатку поштай. Па жаданьню платніка аб аплаце падатку яму можа быць зроблена адзнака ў акладным лісьце.

Падатак можна плаціць там, дзе працуеш, і ня толькі за сваю гаспадарку, але і за гаспадарку сваякоў.

К.

С-г. крэдыт узьнімае гаспадарку.

У ліпені мінулага году група актывістаў-сялян беднякоў і сераднякоў пастанавіла арганізаваць малочную арцель. Сказана—зроблена, і ў Крупіцкую арцель увайшло 70 пайшчыкаў-сялян. Цікава адзначыць, што замож-

ЭФЭКТЫЎНАСЬЦЬ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ: карова, набытая на крэдыт ў 1925 г. і яе прыплод.

ныя не пажадалі „кець справу" з беднатой і самастойна пераапрацоўваюць па сэнаратарах малако і возяць на рынак.

Атрымалі нашы арцельцы з крэдытнай установы 3800 р. крэдыту, набылі самы лепшы загранічны інвэнтар, і праца закіпела.

Пасьля арганізацыі арцелі ў сялян-пайшчыкаў піводнай кроплі малака дарэмна не прападала. Сапраўды, з 5 літрамі на рынак ехаць рахунку няма, а здалі ў арцель, дык зусім іншы малюнак.

Бачыць беднота, што карысьць ад арцелі вялікая, ну, і пайшлі ў с-гаспадарчае крэдытнае таварыства за крэдытам, каб кароў набыць.

Атрымалі крэдыт, набылі кароў, і малако ў арцель пачалі здаваць.

Дзякуючы арцелі, некаторыя з сялян-беднякоў ужо і назыку пасьпелі зьвярнуць.

За 10 месяцаў існаваньня наша малочная арцель вырасла з 70 пайшчыкаў да 273, а лік кароў—са 150 да 566. За гэты час прапушчана праз арцель малака на 6350 пр., а агульны зварот даў 7290 р., нават за такі кароткі тэрмін атрымалі прыбытку 270 руб.

Бачаць сяляне ваколічных вёсак, што з арцельлю пайшчыкі яе хутчэй сваю гаспадарку падымаюць, і самі просяць іх у арцель прыняць.

Зараз Крупіцкая малочная арцель яднае ўжо да 500 пайшчыкаў, якія налічваюць каля 1000 кароў. Дзейнасьць арцелі ахоплівае вёскі радыусам на 12 вёрст. Для абслугоўваньня пайшчыкаў арцель мае 14 зьліўных пунктаў і 1 сьліўка-аддзяліцельны. Як і раней, склад пайшчыкаў—беднякі і сераднякі.

Для паляпшэньня жывёлаводзтва пры арцелі ёсьць 2 кантроль-асыстэнты—працаўнікі акра.

На 1 ліпеня арцель мела ўжо 700 руб. чыстага прыбытку, а колькі яго маюць сяляне, дык іх лепш вядома. Праз арцель сяляне-пайшчыкі за год атрымалі 18 вагонаў макухі і атрубей, а з гэтымі кармамі і жывёла стала больш малака даваць.

— Так, дзякуючы дапамозе дзяржавы, з беднякоў праз год-два і мы сераднякамі будзем,—кажуць сяляне-беднякі, пайшчыкі арцелі.

Мясцовы.

В. Пяцеўшчына, Самахвалавіцкі райён, Меншчына.

ВЕТРАУ ПЛЯНІК.

(З гутаркі сялян).

— Як жывецца, дзядзька Лука?—пытаю свайго старэйшага сабра.

Бачу, павярнуў ён сваю галаву ў мой бок, і лёгенькі сьмяшок прабег па яго твары.

— Як бачыце,—адказвае.

— Што-ж я бачу, пакуль што нічога яшчэ ня бачу,—адказваю яму.

— Як ня бачыш? Глянь на гумно.

— Ну, што?—пытае Лукаш.

— Добрае гумно,—адказваю.

— А страху бачыш?

— Бачу.

— Ну што?

— Вецер падраў,—адказваю.

— Добра?—пытае ён.

— Не, нядобра,—адказваю.

— Дык вось так і жывем. З ветрам ваюем.

Калі ў сьпякоту падзьме крыху, дык яно і добра, а вось, як пачне драць, дык нядобра. І сёлета нешта не разьбярэш: у каго больш, у каго менш у параўнаньні з леташнім годам... Сам гэты, фінансавы, прыяжджаў.

— Адносна страхоўкі?—пытаю.

— Не, адносна аб'ектаў розных.

— Дык вы пра што...?—пытаю

— Яж кажу, пра вецер... розны ён бывае ў гаспадарцы. А колькі гром нарабіў бяды... У Кліпех двaіх старых—мужа з жонкаю—за адным сталом сядзелі, аднаю стралою двaіх палажыла.

Каму рэжым эканоміі, а каму не да жартаў.

— Пра які вы рэжым?..—пытаю.

— Бацюшка раз адпраў і плата была як-ой, скажам, за аднаго,—казаў ён далей.—Яму і крыўдна.—Даўней, кажа, гэтага ня было. Усюды рэжым—і на зямлі і на небе.

— Бывала, лесу колькі хочаш, дзялянкамі дзялілі, а цяпер на порцыі перайшло. А высякаюць як... Па новаму па плянаваму, пад чыстую. А лясы бываюць такія, што ўвесь, можна сказаць, падлесак, толькі сям там стразвы пракідаецца. Дык вось з-за гэтае аднае гадзяшчае хвоі зьністажаецца па 40-50 штук дзесяці ці пятнаццацігадовага падростку.

— Нядобра значыць?—пытаю.

— Нядобра — адказвае дзядзька Лукаш.

— Альбо яшчэ вам плянік. Як вядома, каля поля лес расьце больш ушыркі, распускае шырока сваё галлё. Карані ізноў-жа шырэй разыходзяцца ў бакі.

Яны, гэтыя хвоі ці ёлкі, радчэй—тут растуць, ня так, значыць, густа і затым, значыць, яны ўмацоўваюцца лепш. А гэта што?—А гэта выходзіць заціпак усяму лесу. Яны сядзяць моцна і на вецер ім пляваць.

А новы плянік іх і пазадымаў. Першую лесасеку правёў наўз край.

Як правёў, гэту першую, дык другая бяз плянікa сама лягла. Чуць дых не ветрык, дык 8-10 ёлак і няма, а калі дзьмухне ніштавата, дык і да сотні дагоніць. Кругом ляжаць лясы.

— Нядобра, значыцца?—пытаю.

— Вядома, што нядобра,—пахмура адказвае дзядзька Лукаш, але зараз-жа мяняе тон на весялейшы:

— Але і добра. Вунь, гляньце, за хлявом бярвеньне. Гэта ветраў плянік памог, дай божа яму здароўя.

Селі мы на гэтае бярвеньне з Лукашом—на самае даўжэйшае бервяно, і пачалася ў нас доўгая гутарка пра розныя пляны і плянікі, пра добрыя і нядобрыя. Хто хоча паслухаць, калі ласка. А некатарым, дык мы нават раілі-б паслухаць.

З пашанаю

ВАСІЛЬ БАЗЫЛЁВЫХ.

Настаўніцкая „салідарнасьць", ці што іншае!

(Слуцак).

Летась у III сямігодку была прызначана настаўніца А. Яна папрацавала некалькі месяцаў і пашла ў водпуск па цяжарнасьці. Кончыўся яе водпуск, а яшчэ далёка было да канца году. Больш ёй водпуску страхкаса не дала. Ня гледячы на гэта, яна не працавала да канца году. Цяпер пры «ўкамплектаваньні» высьветлілася, што школа захавалася за ёю, хоць яна і не працавала.

Як-жа так здарылася?

Настаўніца падала заяву ў школьную раду, у якой паведамляла, што больш яна ня будзе працаваць і прасіла пакінуць за ёю школу. Школьная рада, каб не пакрыўдзіць настаўніцу, зрабіла так, як хацела настаўніца. Пастанова была зроблена на карысьць настаўніцы. Дзіўна толькі, чаму на яе не зьвярнуў увагі інспэктар і мясцком?

Гэта пытаньне трэба высьветліць і ў далейшым за такую працу прыцягваць вінаватых да адказнасьці.

Р. С.

1001 НОЧ НА ПОШЦЕ.

(НЯ КАЗКА, А ТРАГІБЫЛЬ У ДЗЬВЮХ ЧАСТКАХ З ТЛУМАЧЭНЬНЯМІ).

ЧАСТКА I.

Аб тым, як настаўнік Мікола Агейчык у культурны паход сабраўся, і які яму зьвер на шляху напаткаўся.

Гэта было на сёмай гадавіне першага веку эпохі Чырвонага Кастрычніка. Жыў-быў актыўны ўдзельнік сацыялістычнага будаўніцтва настаўнік Мікола Агейчык. Вялікі ён быў прыяцель роднай яму беларускай мовы. І пераканаўся ён у вялікім яе значэньні для адраджэньня любай краіны. І давай зьбіраць словы гэтай мовы на Смаленшчыне. Пяць год зьбіраў. Дзесяць тысяч слоў назьбіраў. У Інбелкульт паслаў... А вось тут і дзея пачынаецца.

ДЗЕЯ 1.

Адзін з самых працавітых, нагружаных і актыўных пакояў у Інбелкульце—рэгістратура. За сталом—шэры, сумны начальнік—таварыш-рэгістратар. Сумны таму, што прырода была сумная і шэрая. У вакно барабаніў асенні дождж, а за вакном на дзеравае шалясьцела пажоўклае, як сукно на рэгістратарскім стале, лісьце. Гэты шэлест зьліваўся з шалестам у галаве, які, праўда, узьнік не ад прыроды, а ад шалясьценьня канцылярскіх папер і розных інструкцый. У такім настроі рэгістратар расьпячатаў цэлую пасылку фунтаў на пяць, а ў пасылцы ізноў шалясьцелі паперы—на гэты раз ня з інструкцыямі, а са слоўнікавым матар'ялам. На матар'ялах быў каліграфічны з любоўю выведзены надпіс: „Краёвы слоўнік Смаленшчыны" (жывое мовы). І зусім проста дадавалася: сабраў Мікола Агейчык. Прозьвішча паважаны рэгістратар прачытаў са зьдзіўленьнем, думаючы пра сябе: «знаю я аднаго Міколу—мовазнаўцу, дык гэта сапраўднага, а вось гэтага ня чуў. Ды і той не з Смаленску, не з Магілеву, а, здаецца, з Ноўгараду, ці што? «Подозрительно!..» Затым ён паставіў рэгістрацыйны нумар і аднёс у слоўнікавую камісію.

ДЗЕЯ 2.

У камісіі штат, а ў кожнага са штату—галава, і ў кожнай галаве—рэзалюцыя... У камісіі нядоўга быў слоўнік, дый чаму яму там быць. Адна галава са штату, да якой папаў слоўнік на рэцэнзію, з навуковым «достоинством» прышла ў зьдзіўленьне:—«што, слоўнік з правіцы? Яшчэ не пасьпеў сёньня адаслаць інструкцыю аб формах зьбіраньня, а тут цэлых пяць фунтаў слоўнікавага матар'ялу... Дзесяць тысяч жывых народных слоў... А чым я пераканаю, што гэта жывыя народныя словы, а ня краденыя з слоўніку Дабравольскага? Папершае, гэта саматужніцтва, апалругое—«подозрительно»... Дзесяць тысяч слоў бяз інструкцыі!..»

. . . . . .

На паперы ляжала рэзалюцыя: «надаслаць аўтару дзеля перапрацоўкі, прапанаваць прытрымоўвацца формы, складзенай у інструкцыі па зьбіраньню слоўнікавага матар'ялу».

ДЗЕЯ 3.

Рэгістратура. На белай запакаванай паперы рука рэгістратара выводзіла адрас на пасылцы Міколы Агейчыка. Скрыпела пяро...

ЧАСТКА II.

Аб паштовай стыхіі і інструкцыі, і што замяняе мазгавыя канструкцыі

ДЗЕЯ 1.

І паслаў Інбелкульт слоўнік Агейчыка па адрасу. А як за гэты час прырода зьмяніла сваю вопратку, дык і наш удзельнік сацыялістычнага будаўніцтва Мікола Агейчык быў зьменены начальніцкаю прыродаю з аднэй пасады на другую, і давялося яму пераяжджаць на працу з Магілеву ў Віцебск; а Мікола Агейчык, будучы чалавекам «чувствительным» і «чувствуючым», што слоўнік усё-ж такі ў падзяку за старанную працу прыедзе да свайго гаспадара, рашыў паведаміць пошту аб зьмене адрасу (мала што бывае, хай ведаюць, дзе нас шукаць!). Доўга чакаў свайго слоўніка Мікола Агейчык. Шмат яму прысылалі па новаму адрасу розных напісаных чужымі рукамі лістоў. Бухгальтэрыя аднэй установы (да якой ён меў дачыненьне, працуючы ў Магілеве) заказным лістом двойчы напамінала аб звароце завінавачанасьці 8 з пал. капеек. А слоўніка так і ня слалі.

І калі прырода трэці раз зьмяніла вопратку, заняўся Мікола Агейчык новай пісаніной. Піша ў Інбелкульт, а адтуль адказваюць:

«Паведамляем, што Інбелкультам зроблена запытаньне паштова-тэлеграфнай канторы, кім і калі атрыманы ваш слоўнік, які пасланы ў студзені месяцы 1926 г. у Магілеў, за паштовым квітком № 993, але адказу яшчэ не атрымана».

Затым штамп, нумар рэгістратара і подпісы двух начальнікаў.

ДЗЕЯ 2.

Напісаў Мікола Агейчык загадчыку Магілеўскай паштова-тэлеграфнай канторы (асабіста) і яго канцэлярыі (афіцыйна).

І напалохалі-ж яны яго адказам! Паведамляюць, што па атрыманьні яго слоўніка, апошні накіраваны ў Маскву (!).

— У Маскву!—ахнуў Агейчык,—нічога не разумею! У экскурсію вакол сьвету я яго не пасылаў, да Калініна хадаком не накіроўваў, а чаго ў Маскву—«умри, не поймешь»!—прыпамятаваў рускую прыказку і сеў пісаць запытаньне ў Маскву.

Чакаў, чакаў адказу і да 10-й гадавіны Кастрычнікавай эпохі дачакаўся. К вялікаму сьвяту маскоўскія паштавікі рашылі паслаць Агейчыку вось які падарунак:

«Вследствие заявления от 20 липеня 1927 г. уведомляю, што заказное письмо (добрае „письмо", пяць фунтаў вагою!) поданное в Минске в декабре 1925 г. под расписку за № 993, с адресом в Могилев на имя Агейчика в получении не значится и считается утраченным, почему вы имеете право подать заявление начальнику Белорусского Управления Связи в Смоленск о выдаче вам установленного вознаграждения. К заявлению о выдаче вознаграждения следует приложить настоящее извещение и подлинную почтовую расписку. 8 октября 1927 г. № 13-4041».

І адважыўся Агейчыка раз пе-турбаваць паштовае начальства па справе «утери» (патэрытовага!) заказного письма».

Каліграфічным настаўніцкім почаркам просіць начальства і жаліцца. Пры гэтым далікатна (у адпаведнасьці, каму пішацца) напамінае ўсю гісторыю «хождения по мукам» яго слоўніка, нэрваў і зношаных ботаў. У канцы просіць ласкі зьвярнуць, згодна існуючых законаў, хоць па залатоўцы за страчаныя дні—за апрацоўку слоўніка. Але начальства кіруецца ня фактамі, апісанымі ласкавым словам. Начальства ня любіць, калі з ім «разсуждают и указывают закон». Начальства само ня горш «усякага там» ведае законы. Недарма паштовае начальства жыве інструкцыямі.

. . . . . .

Прынёс паштальён адказ. Нэрвова прачытаў яго Агейчык.

„Белорусское Управление Связи, отдел почтовый, гражданину Агейчику, город Витебск, Канатная, 34, наш № 4132-а, февреля 1 дня 1928 г. На заявление ваше от 2-I—28 г. по вопросу розыскания заказной бандероли за № 993, посланной вам Инспектором Белкульта в декабре 1925 года, сообщаем, что, согласно ст. 687 Постановлений по почтовой части, право на получение вознаграждения за утерянные отправления определено годичным сроком, если в период этого времени не было предпринято мер к розыскению. Поскольку указанная ваша бандероль была отправлена в 1925 г. и со дня подачи таковой до подачи заявления о розыскании прошло уже 2 года, то в данном случае результаты розыска не дадут положительных результатов и право отправителя на получение установленного вознаграждения истекло". Штамп і подпісы двох начальнікаў.

. . . . . .

Нічога не зразумеў Агейчык. Сам сябе не пазнаваў. Ці жыве ён, мо' сьпіць і бачыць кашмарны сон часоў Мікалая II?!!!

У вочы ўрэзалася старонка календара, у памяці прайшла цэлая гісторыя. Прыпомніў ён, як 31 кастрычніка 1925 г. паслаў слоўнік „Инспектору Белкульта" (па «выражению» вядомых беларусаведаў з Управы Беларускай паштовай акругі)... Прышлі на памяць не адна заява, дасланая потым з просьбай адшукаць яго слоўнік. Узяў ён сабе, паглядзеўшы на каляндар, што паштовы стаж гэтага слоўніку 1001 дзень і 1001 ноч...

ДЗЕЯ 3.

Сядзіць хмуры, як асенні дзень,

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗАЦЬВЕРДЖАНЬНЕ ПАЛАЖЭНЬНЯ АБ НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА БССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Зацьвердзіць Палажэньне аб Народным Камісарыяце Земляробства БССР.

2. Скасаваць Палажэньне аб Народным Камісарыяце Земляробства БССР за 3 лістапада 1924 году (З. З. БССР 1924 г., № 25-26, арт. 229).

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. КАРКЛІН.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. СТАШЭЎСКІ.

18 жніўня 1928 г. г. Менск.

ПАЛАЖЭНЬНЕ

аб Народным Камісарыяце Земляробства БССР.

1. Народны Камісарыят Земляробства БССР ажыцьцяўляе зямельную, сельска-гаспадарчую і лясную палітыку Ураду БССР, ведае і кіруе зямельным і лясным фондамі БССР і агульным кіраваньнем, плянаваньнем і кантролем над ажыцьцяўленьнем усіх мерапрыёмстваў Ураду ў галіне сельскае і лясное гаспадаркі для найбольш поўнага і ўсебаковага разьвіцьця яе вытворчых сіл у напрамку сацыялістычнага будаўніцтва.

2. У галіне сельскае гаспадаркі і ветэрынарыі Народны Камісарыят Земляробства:

а) усебакова вывучае сельскую гаспадарку;

б) распрацоўвае пытаньні эканомікі сельскае гаспадаркі;

в) кіруе працаю мясцовых органаў улады па падъёму і разьвіцьцю вытворчых сіл усіх галін сельскае гаспадаркі: палеводства, лугаводства, садоўніцтва, гародніцтва і ўсіх відаў жывёлагадоўлі;

г) распрацоўвае мерапрыёмствы калектывізацыі, індустрыялізацыі і электрыфікацыі сельскае гаспадаркі і дапамагае іх правядзеньню;

д) удзельнічае ў распрацоўцы пытаньняў каапераваньня і кредытаваньня сельскае гаспадаркі і ўгледнае плянавыя мерапрыёмствы ў галіне сельскае гаспадаркі з каапэрацыйнымі і кредытнымі ўстановамі (Белсельсаюз і Белсельбанк), а таксама з установамі, якія маюць на мэце забясьпечаньне сельскае гаспадаркі сродкамі вытворчасьці і насеньнем;

е) удзельнічае ў распрацоўцы спэцыяльных мерапрыёмстваў для павялічэньня экспарту прадукцыі і сельскае гаспадаркі;

ж) устанаўляе парадак арганізацыі зямельнага фонду БССР, найбольш рацыянальныя формы землякарыстаньня і дапамогі інтэнсыфікацыі земляробства;

з) праводзіць агульнае кіраваньне працаю агранамічнае сеткі, дае дырэктывы ў справе арганізацыі гэтае сеткі, а таксама пракатных, зернаачышчальных і злучных пунктаў;

і) арганізуе гатункоўнае насеннаводзтва;

к) распрацоўвае мерапрыёмствы для палепшэньня кармавое справы;

л) праводзіць агульнае кіраваньне ветэрынарнаю справаю для абслугоўваньня насельніцтва лекавай, санітарнай і эпізоотычнай ветэрынарнаю дапамогай;

м) удзельнічае ў распрацоўцы пытаньняў страхаваньня сельска-гаспадарчае жывёлы;

н) арганізуе конскія заводы і рассадзікі племянной жывёлы;

о) удзельнічае ў разглядзе міжнародных дагавораў і канвэнцый, якія датычаць ветэрынарна-санітарнага забясьпечаньня імпартуемае і экспартуемае жывёлы і сырых жывёлавых прадуктаў і гандлю імі;

п) арганізуе навуковыя і навукова-дасьледчыя ветэрынарныя ўстановы;

р) праводзіць агульнае кіраваньне і нагляд над дасьледчымі і паказальнымі мерапрыёмствамі і над сеткаю дасьледчых устаноў, якія знаходзяцца пад беспасрэднымі ведамам Народнага Камісарыяту Земляробства, і ўдзельнічае ў распрацоўцы праграмы і плянаў іншых дасьледчых устаноў рэспубліканскага значэньня і саюзнага значэньня на тэрыторыі БССР для ўзгадненьня іх з патрэбамі сельскае гаспадаркі БССР;

с) удзельнічае ў распрацоўцы пытаньня сельска-гаспадарчае і ветэрынарнае адукацыі, арганізуе распаўсюджаньне ведаў па сельскай гаспадарцы і ветэрынарыі сярод насельніцтва і дапамагае практычнаму ўжываньню навукова-дасьледчых дасягненьняў у сельскай гаспадарцы;

т) накіроўвае дзейнасьць арганізацый сельска-гаспадарчага характару, якія ўзьнікаюць на ініцыятыве насельніцтва, і дапамагае ім;

у) арганізуе барацьбу са шкоднікамі сельскае гаспадаркі і з масавымі стыхійнымі нішчасьцямі ў сельскай гаспадарцы.

3. У галінах земляўпарадкаваньня, мэліярацыі, сельскага будаўніцтва і дзяржаўнае зямельнае маемасьці Народны Камісарыят Земляробства:

а) праводзіць агульнае кіраваньне ажыцьцяўленьнем зямельнае палітыкі ў галіне землякарыстаньня, упарадкаваньнем і падлікам зямельнага фонду Рэспублікі, рэгулюе зямельна-праўныя і водна-праўныя адносіны;

б) кіруе землеўпарадкаваньнем на землях працоўнага карыстаньня ў напрамку стварэньня эканамічна выгадных форм землякарыстаньня, землеўпарадкаваньнем дзяржаўнае зямельнае маемасьці, адмежаваньнем зямельных плошчаў, складаючых лясны фонд Рэспублікі, а таксама зямель гарадоў і мястэчак і зямель спэцыяльнага прызначэньня, вышуканьнем, арганізацыяй, разьмеркаваньнем і ўпарадкаваньнем калёнізацыйнага фонду для надзяленьня зямлёю безьзямельнага і малазямельнага працоўнага насельніцтва;

в) ажыцьцяўляе спэцыяльныя пастановы Ураду аб падрыхтоўцы зямельных фондаў для працоўных яўрояў і аб землеўпарадкаваньні іх у межах БССР, а таксама садзейнічае іх перасяленьню за межы БССР;

г) садзейнічае калектывізацыі сельскае гаспадаркі і арганізацыі сацыялістычных форм землякарыстаньня;

д) кіруе зямельнаю рэгістрацыяй і праводзіць зямельны кадастар (падрабязнае апісаньне зямельных вучасткаў, з паказаньнем адзнакі іх даходнасьці);

е) вывучае аграрную перанаселенасьць і кіруе арганізацыяй расселэньня ў Рэспубліцы, перасяленьня за межы Рэспублікі і ўдзельнічае ў працы Усесаюзнага Перасяленчага Камітэту;

ж) кіруе сельскім будаўніцтвам, у пасобку агнятрывалым і будаўніцтвам для забясьпечаньня вадою, дапамагае арганізацыі таварыстваў агнятрывалага і іншага сельскага будаўніцтва і праводзіць тэхнічную дапамогу ім;

з) вывучае і арганізуе паводле Водна-Мэліярацыйнага Кодэксу БССР водны рэжым, адведнае з інтарэсамі сельскае, лясное і іншых галін народнае гаспадаркі;

і) кіруе мэліярацыйнымі вышуканьнямі і работамі па сельска-гаспадарчай гідратэхніцы і культур-тэхніцы, якія маюць на мэце пашырыць працоўнае і дзяржаўнае землякарыстаньне і павялічыць вытворчасьць лугавых і палявых плошчаў;

к) беспасрэдна праводзіць мэліярацыйныя работы рэспубліканскага і саюзнага значэньня на тэрыторыі БССР;

л) падлічае і ахоўвае існуючыя каналы і пабудовы на іх;

м) узгадняе агрыкультурныя і мэліярацыйныя мерапрыёмствы з землеўпарадкаваньнем;

н) кіруе арганізацыяй торфавага фонду Рэспублікі, дасьледаваньнем і вывучэньнем торфу і спосабаў здабываньня і скарыстаньня яго на апал і для сельска-гаспадарчых патроб (падсьціл, угнаеньне і інш.), а таксама вядзе агульны нагляд за правільнаю эксплёатацыяй торфавых залежаў;

о) дапамагае арганізацыі і дзейнасьці мэліярацыйных і торфавых таварыстваў;

п) садзейнічае арганізацыі тэхнічнае дапамогі мэліярацыйным і торфавым таварыствам, савецкім гаспадаркам і ўстановам для выкананьня імі мэліярацыйных гідратэхнічных і культуртэхнічных работ;

р) нагляд за скарыстаньнем па прыналежнасьці мэліярацыйнага крэдыту;

с) устанаўляе парадак і спосабы плянамернае эксплёатацыі дзяржаўнае зямельнае маемасьці і пабудоў у інтарэсах далейшага разьвіцьця народнае гаспадаркі;

т) разглядае агульны вытворчы плян скарыстаньня дзяржаўнае зямельнае маемасьці рэспубліканскага значэньня;

у) заключае дагаворы на дзяржаўную зямельную маемасьць;

ф) выраблае спрэчкі аб маемасьці рэспубліканскага значэньня;

х) арганізуе, кіруе і рэвізуе трэставыя савецкія гаспадаркі;

ц) праводзіць агульнае кіраваньне рыбнаю гаспадаркаю, арганізуе рыбаводныя гаспадаркі рэспубліканскага значэньня і зацьвярджае дагаворы аб іх эксплёатацыі;

ч) загадвае цэнтральным зямельным водна-мэліярацыйным архівам і наглядае за акруговымі архівамі;

ш) арганізуе забясьпечаньне геадэзічнымі і іншымі інструмэнтамі і прыладамі і загадвае цэнтральнаю камэраю геадэзічных інструмэнтаў;

э) праводзіць досьледы ў галінах землеўпарадкаваньня, мэліярацыі і сельскага будаўніцтва;

ю) удзельнічае ў распрацоўцы праграм і плянаў дасьледчых устаноў рэспубліканскага значэньня па пытаньнях землеўпарадкаваньня, мэліярацыі, сельскага будаўніцтва і дзяржаўнае зямельнае маемасьці;

я) удзельнічае ў распрацоўцы пытаньняў землеўпарадчае і мэліярацыйнае адукацыі і робіць захады да прапаганды сярод насельніцтва ведаў па гэтых галінах.

4. У галіне лясное гаспадаркі Народны Камісарыят Земляробства:

а) усебакова вывучае лясную гаспадарку;

б) распрацоўвае пытаньні эканомікі лясное гаспадаркі;

в) кіруе арганізацыяй плянавага ўпарадкаваньня лясоў дзяржаўнага значэньня і камплектаваньнем лесаўпарадчых партый;

г) праводзіць агульнае кіраваньне ўпарадкаваньнем лясоў мясцовага значэньня і вядзеньнем гаспадаркі ў іх;

д) устанаўляе парадак пераходу падлесных плошчаў на іншы від угоддзяў і наадварот;

е) арганізуе лесаадваўленьне, лесамэліярацыю і лясное будаўніцтва;

ж) кіруе спэкуляцыяй лясоў, агульным падлікам лесасечнага фонду і складае кантрольныя лічбы для разьмеркаваньня яго паміж дзяржаўнымі спажыўцамі і насельніцтвам;

з) канчаткова разглядае пратэзы на дзейнасьці акруговых лясных камісій для разьмеркаваньня лесасечнага фонду;

і) разьмяркоўвае па акругах фонды на кредытаваньне, на льготныя і бясплатныя водпускі лесу насельніцтву;

к) устанаўляе парадак карыстаньня пабочнымі карыстаньнямі ў лясох;

л) праводзіць мерапрыёмствы для палепшэньня лесавозных шляхоў;

м) вядзе гаспадарчыя распрацоўкі лесу на пастаўке спэцыяльнага палажэньня;

н) удзельнічае ў распрацоўцы спэцыяльных мерапрыёмстваў для павялічэньня экспарту прадукцыі лясное гаспадаркі;

о) кіруе лесаэканамічнымі дасьледваньнямі і ўдзельнічае ў распрацоўцы пытаньняў лясное дасьледчае справы;

п) удзельнічае ў распрацоўцы пытаньняў лясное адукацыі;

р) дапамагае ўтварэньню і працы грамадзкіх арганізацый, якія маюць на мэце разьвіцьцё і палепшаньне лясное гаспадаркі;

с) арганізуе барацьбу са шкоднікамі лесу і з масавымі навальнымі нішчасьцямі ў лясной гаспадарцы, у пасобку з лясными пажарамі, а таксама распрацоўвае мерапрыёмствы для аховы лясоў ад самавольных парубак.

т) праводзіць агульнае кіраваньне паляўнічаю гаспадаркай і барацьбой з драпежнікамі, арганізуе заказьнікі і беспасрэдна кіруе іх гаспадаркай.

5. На чале Народнага Камісарыяту Земляробства стаіць Народны Камісар і яго намесьнікі.

6. Пры Народным Камісары пад яго старшынствам існуе Калегія.

7. У склад Народнага Камісарыяту Земляробства ўваходзяць:

а) Аддзел сельскае гаспадаркі і ветэрынарыі;

б) Аддзел землеўпарадкаваньня, мэліярацыі, сельскага будаўніцтва і дзяржаўнае зямельнае маемасьці;

в) Лясны Аддзел;

г) Адміністрацыйна-Арганізацыйны Аддзел.

8. Для апрацоўкі пытаньняў эканомікі пэрспэктыўнага плянаваньня сельскае і лясное гаспадаркі, якія выходзяць за межы кампэтэнцыі паасобных частак апарату, для плянавае каардынацыі тых мерапрыёмстваў па паасобных галінах, якія намачаюцца апэрацыйнымі, пяцёхгадовымі і генэральнымі плянамі разьвіцьця сельскае і лясное гаспадаркі, а таксама для ўдзелу ў распрацоўцы пытаньняў кредытаваньня сельскае і лясное гаспадаркі ў складзе Народнага Камісарыяту Земляробства існуе Плянавая Камісія.

Да паасобных задач Плянавае Камісіі належыць:

а) распрацоўка пытаньняў калектывізацыі, індустрыялізацыі, электрыфікацыі і механізацыі сельскае і лясное гаспадаркі;

б) разгляд гадовых і пэрыядычных справаздач аб працы Народнага Камісарыяту Земляробства і падпарадкаваных яму устаноў і праверка справаздач з пункту погляду адведнасьці іх плянам;

в) распрацоўка па заданьнях Народнага Камісара самастойных навукова-практычных пытаньняў у галіне сельскае і лясное гаспадаркі;

г) распрацоўка розных матар'ялаў для высьвятленьня становішча і дынамікі сельскае і лясное гаспадаркі БССР.

9. Пры Народным Камісарыяце Земляробства знаходзіцца Асобная Калегія Вышэйшага Кантролю па зямельных, водна-мэліярацыйных і землеўпарадчых справах, склад і парадак дзейнасьці якой вызначаюцца спэцыяльным палажэньнем.

10. Пры Народным Камісарыяце Земляробства пад яго агульным кіраваньнем знаходзіцца сельска-гаспадарчы трэст, сельска-гаспадарчы склад, Цэнтральны Дом Селяніна, Выдавецтва Народнага Камісарыяту Земляробства і прадпрыёмствы на гаспадарчым разрахунку, якія дзейнічаюць на падставе асобных палажэньняў.

11. Для навуковае распрацоўкі пытаньняў дзейнасьці Народнага Камісарыяту Земляробства пры ім могуць існаваць на падставе асобных палажэньняў спэцыяльныя камітэты з практычных і навуковых працаўнікоў.

12. Народны Камісарыят Земляробства мае права склікаць спэцыяльныя зьезды і нарады, арганізоўваць курсы, лекцыі і выдаваць сельска-гаспадарчую літаратуру.

13. Народны Камісарыят Земляробства мае права рэвізаваць падпарадкаваныя яму установы і прадпрыёмствы, а таксама па пытаньнях свае кампэтэнцыі—мясцовыя органы улады.

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Сташэўскі.

18 жніўня 1928 году.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

ОБ УТВЕРЖДЕНИИ ПОЛОЖЕНИЯ О НАРОДНОМ КОМИССАРИАТЕ ЗЕМЛЕДЕЛИЯ БССР.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1, Утвердить Положение о Народном Ко-миссариате Земледелия БССР.

2. Отменить Положение о Народном Ко-миссариате Земледелия БССР от 3 ноября 1924 года (С. З. БССР 1924 года, № 25-26, ст. 229).

Вр. исп. об. Председателя Центр. Исполнительного Комитета БССР А. ХАЦКЕВИЧ

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР М. КАРКЛИН.

За Секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР А. СТАШЕВСКИЙ.

18-го августа 1928 г. г. Минск.

ПОЛОЖЕНИЕ

о Народном Комиссариате Земледелия БССР.

1. Народный Комиссариат Земледелия БССР осуществляет земельную, сельско-хозяйственную и лесную политику Правительства БССР: ведает и управляет земельным и лесным фондами БССР и общим руководством, планированием и контролем над осуществлением всех мероприятий Правительства в области сельского и лесного хозяйства для наиболее полного и всестороннего развития его производительных сил в направлении социалистического строительства.

2. В области сельского хозяйства и ветеринарии Народный Комиссариат Земледелия:

а) всесторонне изучает сельское хозяйство;

б) разрабатывает вопросы экономики сельского хозяйства;

в) руководит работой местных органов власти по под'ёму и развитию производительных сил всех отраслей сельского хозяйства: полеводства, луговодства, садоводства, огородничества и всех видов животноводства;

г) разрабатывает мероприятия коллективизации, индустриализации и электрификации сельского хозяйства и содействует их проведению;

д) участвует в разработке вопросов кооперирования и кредитования сельского хозяйства и согласовывает плановые мероприятия в области сельского хозяйства с кооперативными кредитными учреждениями (Белсельсоюз и Белсельбанк), а также с учреждениями, имеющими целью обеспечение сельского хозяйства средствами производства и семенами;

е) участвует в разработке специальных мероприятий по увеличению экспорта продукции сельского хозяйства;

ж) устанавливает порядок организации земельного фонда БССР, наиболее рациональные формы земленользования и содействует интенсификации земледелия.

з) проводит общее руководство работой агрономической сети, дает директивы в деле организации этой сети, а также прокат-ных, зерноочистительных и злучных пунктов;

и) организует сортовое семеноводство;

к) разрабатывает мероприятия по улучшению кормового дела.

л) проводит общее руководство ветеринарным делом для обслуживания населения лечебной, санитарной и эпизоотической ветеринарной помощью;

м) участвует в разработке вопросов страхования сельскохозяйственного скота;

н) организует конские заводы и рассадники племенного скота;

о) участвует в рассмотрении международных договоров и конвенций, касающихся ветеринарно-санитарного обеспечения импортируемого и экспортируемого скота и сырых животных продуктов и торговли ими;

п) организует научные и научно-исследовательские ветеринарные учреждения;

р) проводит общее руководство и надзор за опытными и показательными мероприятиями и за сетью опытных учреждений, находящихся в непосредственном ведении Народного Комиссариата Земледелия и участвует в разработке программ и планов других опытных учреждений республиканского значения и союзного значения на территории БССР для согласования их с нуждами сельского хозяйства БССР;

с) участвует в разработке вопросов сельскохозяйственного и ветеринарного образования, организует распространение знаний по сельскому хозяйству и ветеринарии среди населения и содействует практическому применению научно-исследовательских достижений в сельском хозяйстве;

т) направляет деятельность организаций сельско-хозяйственного характера, возникающих по инициативе населения, и оказывает им содействие;

у) организует борьбу с вредителями сельского хозяйства и с массовыми стихийными бедствиями в сельском хозяйстве.

3. В области землеустройства, мелиорации, сельского строительства и государственных земельных имуществ Народный Комиссариат Земледелия:

а) проводит общее руководство осуществлением земельной политики в области землепользования, упорядочением и учетом земельного фонда Республики, регулирует земельно-правовые и водно-правовые отношения;

б) руководит землеустройством на землях трудового пользования в направлении создания экономически-выгодных форм землепользования; землеустройством государственных земельных имуществ, ограничением земельных площадей, составляющих лесной фонд Республики, а также земель городов и местечек и земель специального назначения, изысканием, организацией, распределением и устройством колонизационного фонда для земленаделения безземельного и малоземельного трудового населения;

в) осуществляет специальные постановления правительства о подготовке земельных фондов для трудящихся евреев и о землеустройстве их в пределах БССР, а также содействует их переселению за пределы БССР.

г) содействует коллективизации сельского хозяйства и организации социалистических форм землепользования;

д) руководит земельной регистрацией и проводит земельный кадастр (подробное описание земельных участков с указанием оценки их доходности);

в) изучает аграрную перенаселенность и руководит организацией расселения в Республике, переселения за пределы Республики и участвует в работе Всесоюзного Переселенческого Комитета;

ж) руководит сельским строительством, в частности—огнестойким и строительством по водообеспечению, содействует организации товариществ огнестойкого и другого сельского строительства и оказывает им техническое содействие;

з) изучает и организует согласно Водно-Мелиоративного Кодекса БССР водный режим соответственно интересам сельского, лесного и других отраслей народного хозяйства;

и) руководит мелиоративными изысканиями и работами по сельско-хозяйственной гидротехнике и культуртехнике, имеющими целью расширить трудовое и государственное землепользование и увеличить производительность луговых и полевых площадей;

к) руководит научно-исследовательскими работами республиканского и союзного значения на территории БССР;

л) учитывает и охраняет существующие каналы и сооружения на них;

м) согласовывает агрикультурные и мелиоративные мероприятия с землеустройством;

н) руководит организацией торфяного фонда Республики, исследованием и изучением торфа и способов добычи и использования его на отопление и для сельскохозяйственных нужд (подстилка, удобрение и проч.), а также ведет общий надзор за правильной эксплоатацией торфяных залежей;

о) содействует организации и деятельности мелиоративных и торфяных товариществ;

п) содействует организации технической помощи мелиоративным и торфяным товариществам, советским хозяйствам и учреждениям для выполнения ими мелиоративных, гидротехнических и культуртехнических работ;

р) осуществляет надзор за использованием по назначению мелиоративного кредита;

с) устанавливает порядок и способы планомерной эксплоатации государственных земельных имуществ и сооружений в интересах дальнейшего развития народного хозяйства;

т) рассматривает общий производственный план использования государственных земельных имуществ республиканского значения;

у) заключает договоры на государственное земельное имущество;

ф) разрешает споры об имуществе республиканского значения;

х) организует, руководит и ревизует трестированные советские хозяйства;

ц) проводит общее руководство рыбным хозяйством, организует рыбоводные хозяйства республиканского значения и утверждает договоры об их эксплоатации;

ч) заведует центральным земельным и водно-мелиоративным архивом и осуществляет надзор за окружными архивами;

ш) организует обеспечение геодезическими и другими инструментами и принадлежностями и заведует центральной камерой геодезических инструментов;

э) проводит исследования в областях землеустройства, мелиорации и сельского строительства;

ю) участвует в разработке программ и планов исследовательских учреждений республиканского значения по вопросам землеустройства, мелиорации, сельского строительства и государственных земельных имуществ;

я) участвует в разработке вопросов землеустроительного и мелиоративного образования и принимает меры к пропаганде среди населения знаний по этим отраслям.

4. В области лесного хозяйства Народный Комиссариат Земледелия:

а) всесторонне изучает лесное хозяйство;

б) разрабатывает вопросы экономики лесного хозяйства;

в) руководит организацией планового устройства лесов государственного значения и комплектованием лесоустроительных партий;

г) проводит общее руководство устройством лесов местного значения и ведением хозяйства в них;

д) устанавливает порядок перехода подлесных площадей в другой вид угодий и наоборот;

е) организует лесовозобновление, лесомелиорацию и лесное строительство;

ж) руководит эксплоатацией лесов, общим учетом лесосечного фонда и составляет контрольные цифры для распределения его между государственными потребителями и населением;

з) окончательно рассматривает претензии на действия окружных лесных комиссий по распределению лесосечного фонда;

и) распределяет по округам фонды на кредитование, на льготный и бесплатный отпуск леса населению;

к) устанавливает порядок пользования побочными пользованиями в лесах;

л) проводит мероприятия по улучшению лесоговых путей;

м) ведет хозяйственные разработки леса на основании специального положения;

н) участвует в разработке специальных мероприятий для увеличения экспорта продукции лесного хозяйства;

о) руководит лесоэкономическими исследованиями и принимает участие в разработке вопросов лесного опытного дела;

п) участвует в разработке вопросов лесного образования;

р) содействует организации и работе общественных организаций, имеющих целью развитие и улучшение лесного хозяйства;

с) организует борьбу с вредителями леса и массовыми стихийными бедствиями в лесном хозяйстве, в частности с лесными пожарами, а также разрабатывает мероприятия по охране лесов от самовольных порубок;

т) проводит общее руководство охотничьим хозяйством и борьбой с хищниками, организует заповедники и непосредственно руководит их хозяйством.

5. Во главе Народного Комиссариата Земледелия стоит Народный Комиссар и его заместители.

6. При Народном Комиссаре под его председательством находится Коллегия.

7. В состав Народного Комиссариата Земледелия входят:

а) Отдел Сельского Хозяйства и Ветеринарии;

б) Отдел Землеустройства, мелиорации, сельского строительства и государственных земельных имуществ;

в) Лесной Отдел;

г) Администр.-Организационный Отдел.

8. Для разработки вопросов экономики перспективного планирования сельского и лесного хозяйства, выходящих за пределы компетенции отдельных частей аппарата, для плановой координации тех мероприятий по отдельным областям, которые намечаются операционными, пятилетними и генеральными планами развития сельского и лесного хозяйства, а также для участия в разработке вопросов кредитования сельского и лесного хозяйства в составе Народного Комиссариата Земледелия существует Плановая Комиссия.

К отдельным задачам Плановой Комиссии:

а) разработка вопросов коллективизации, индустриализации, электрификации и механизации сельского и лесного хозяйства;

б) рассмотрение годовых и периодических отчетов о работе Народного Комиссариата Земледелия и подведомственных ему учреждений и проверка отчетов с точки зрения соответствия их планам;

в) разработка по заданиям Народного Комиссариата самостоятельных научно-практических вопросов в области сельского и лесного хозяйства;

г) разработка разных материалов для выяснения положения и динамики сельского и лесного хозяйства БССР.

9. При Народном Комиссариате Земледелия находится Особая Коллегия Высшего Контроля по земельным, водно-мелиоративным и землеустроительным делам, состав и порядок деятельности которой определяется специальным положением.

10. При Народном Комиссариате Земледелия под его общим руководством находится сельско-хозяйственный трест, сельскохозяйственный склад, Центральный Дом Крестьянина, Издательство Народного Комиссариата Земледелия и предприятия на хозяйственном расчете, действующие на основании особых положений.

11. Для научной разработки вопросов деятельности Народного Комиссариата Земледелия при нем могут существовать на основании особых положений специальные комитеты с практических и научных работников.

12. Народный Комиссариат Земледелия имеет право созывать специальные съезды и совещания, организовывать курсы, лекции и издавать сельско-хозяйственную литературу.

13. Народный Комиссариат Земледелия имеет право ревизовать подведомственные ему учреждения и предприятия, а также по вопросам своей компетенции—местные органы власти.

Вр. исп. об. Председателя Центрального Исполнит. Комитета БССР А. Хацкевич.

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР М. Карклин.

За Секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Сташевский.

18 августа 1928 г. г. Минск.

ХРОНІКА.

У бюро скаргаў НК РСІ.

За фармальныя адносіны—на від.

Капыльскі РВК фармальна аднёсься да запытаньняў бюро скаргаў НК РСІ па оправе выплаты селянам в. Цімкавічы запрацаваных грошай. Бюро скаргаў, разгледзеўшы гэту справу, паставіла на від нам. старш. РВК Гурскаму за фармальныя адносіны да гэтай справы, а таксама пастаўлена на від старшыні РВК Іванову за несваевучасовую выплату грошай селянам.

Нядбайныя адносіны да наведвальнікаў.

Бюро скаргаў абвесьціла вымову супрацоўніку Менскага Аирфа Шунейку за нэпаважлівыя адносіны да наведвальнікаў. Таксама адзначаны нядбайныя адносіны да наведвальнікаў з боку інспэктара Аирфа Ліба, які прымусіў рабочага-будаўніка Абрамовіча аж чатыры разы хадзіць, каб запоўніць штрафную картку.

Прадалі гумно двум пакупцом.

Аршанская РСІ наўважліва вырашала скаргу гр-на Тамаркіна Язэпа, які скардзіўся на Горацкую райземкамісію за адначасовы продаж гумна двум пакупцом.

Бюро скаргаў пастанавіла прыцягнуць да адказнасьці винаватых у гэтай справе; апрача гэтага, запрапанавана Аршанскаму АВК, каб ён прынаў меры да звароту гр. Тамаркіну ўзятыя ў яго грошы і жыта за будынак, які быў прададзен другой асобе

Двухгадовая валакіта.

Бюракратычны апарат Гомельскага аддзяленьня «Лесбелу» ў працяту двух гадоў цягне валакіту па выплаце гр-ну Гельфанду грошай за звышурочную працу.

Запрапанавана праўленьню «Лесбелу» винаватых у двухгадовай валакіце прыцягнуць да адказнасьці.

Барацьба з бяспрытульнасьцю.

Дзіцячы месячнік у Віцебску.

У Віцебскай акрузе месячнік барацьбы з бяспрытульнасьцю распачнецца 15-га верасьня. З 1-га верасьня сіламі дзіцячай камісіі ў горадзе арганізуюцца яслі на 65 ложак.

Як мы змагаемся з бяспрытульнасьцю.

Менскі мастак Кругер зараз піша карціну на тэму аб бяспрытульнасьці. Карціна малюе жыцьцё бяспрытульных дзяцей у працоўных калёніях. Карціна будзе гатова да Кастрычніцкавых урачыстасьцей.

Бяспрытульныя—у калёніі.

Менскі акруговы аддзел Нарасьветы прыняў у прыёмнік 37 новых бяспрытульных. 50 дзяцей, якія да гэтага часу знаходзіліся ў прыёмніку, зараз разьмеркаваны па дзіцячых калёніях.

Менскі дзень.

— Заняткі ў сямігодках пачнуцца з 1-га верасьня, а ў вясковых 4-хгадовых школах з 15-га верасьня.

— Палажэньне аб годнасьці «Актывіста ТДА Авіяхіму» зацьверджана ЦС ТДА Авіяхіму. Годнасьць «актывіста ТДА Авіяхіму» прызначаецца за актыўную працу ў ячэйцы.

— 675 тон сырцу-шчаціны выдзелена на 1928-29 год для забясьпечаньня шчаціных фабрык у БССР. Гэта дасьць магчымасьць павялічыць выпуск прадукцыі на 20 проц.

— Усебеларускі зьезд працаўніноў зямлі і лесу перанесен з 3 верасьня на 3-га кастрычніка.

У зьезьдзе прымуць удзел 150 дэлегатаў.

— Навукова-тэхнічныя лекцыі для пізнэраў наладжвае праўленьне БДУ ў цэнтральным пінэр-клюбе па фізіцы, хэміі і інш. Лекцыі будуць чытацца студэнтамі.

— 807 калгасаў налічваецца зараз на БССР. З гэтай колькасьці камун—63, калгасаў—609 і таварыстваў па грамадзкай апрацоўцы зямлі—135.

ДА АБМЕЖАВАНЬНЯ ПРОДАЖУ СЬПІРТНЫХ НАПІТКАЎ.

Народны Камісарыят Унутраных спраў распрацаваў праэкт урадавае пастановы аб абмежаваньні продажу гарэлкі, піва і інш. сьпіртных напіткаў. Гэты праэкт прадугледжвае наступнае:

Каапэрацыйным і грамадзкім арганізацыям забараняецца продаж сьпіртных напіткаў (гарэлка, піва); прадаваць сьпіртныя напіткі будуць выключна спэцыяльныя (кінныя) крамы.

Далей праэкт прадугледжвае забарону памяньшэньня сеткі крам, гандлюючых гэтымі напіткамі, таксама будзе абмежаваны час продажу піва.

Дзеля разгляду гэтага праэкту 31 жніўня пры НКУС склікаецца нарада з прадстаўнікоў запікаўленых устаноў.

У Менск прыяжджаюць дэлегаты кангрэсу КІМ'у.

Дня ўдзелу ў сьвятах 14-га Міжнароднага Юнацкага Дню ў Менск прыяжджаюць дэлегаты кангрэсу Кім'у. Дэлегаты будуць выступаць на агульна-гарадзкіх сходах рабоча-селянскай моладзі з прывітаньнямі ад Кангрэсу. У Менску дэлегаты прабудуць 3-4 дні.

Пашырэньне школьнай сеткі.

Сёлета сетку школьных кампдэнтаў 1-га канцэнтру па БССР мяркуецца павялічыць на 819 адзінак. Гэтыя новыя камплекты будуць адчынены, галоўным чынам, у вясковых мясцовасьцях.

Акрамя гэтага, сёлета ў кожнай акрузе будуць адчынены 2 новыя сямігодкі і 60 новых гадоў навучаньня курс сямігодкі.

32 інтэрнаты для дзяцей беднаты.

Сёлета пры сямігодках будуць адчынены для дзяцей беднаты 32 новыя інтэрнаты. Кожны інтэрнат каштуе ў сярэднім—1200 руб. Зараз гэткіх інтэрнатаў пры сямігодках ужо маецца 81. Акрамя гэтага, мяркуецца адпусьціць на дапамогу дзецям беднаты 142000 руб.

Дом пісьменьнікаў у Менску.

Для дому пісьменьнікаў, які арганізуецца ў Менску, адводзіцца памяшканьне Беларускага Камунальнага Банку. Апошні сяройдзе ў сваё новае памяшканьне на рагу вуліц Ленінскай і Карла Маркса.

Скончыўся прыём у Камвуз БССР.

Скончыўся прыём у Камуністычны Унівэрсытэт імя Леніна. Усяго было накіравана акруговымі камітэтамі 150 чал. Прайшлі мандатную камісію і дапушчаны да экзаменаў—140 чал. Усяго будзе прынята на 1-шы і падрыхтоўчы курсы—90 чал. Іспыты працягнуцца з 1 да 8 верасьня. Заняткі з наступіўшымі пачнуцца 17 верасьня, а заняткі на старшых курсах з 3-га верасьня.

Прызначэньне пэрсанальнай пэнсіі.

Міжведамсьцьвенная камісія пры Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпекі пастанавіла вызначыць рабочаму Мельнікаву Сяргею Рыгоравічу пэрсанальную пэнсію ў разьмеры 50 руб. у месяц. Тав. Мельнікаў удзельнічаў у баёх супроць Чохаславакаў пад Казанью ў 1918 г., а таксама супроць Калчака і Дэнікіна ў 1918-1919 гадох. За храбрасьць, выяўленую ў баёх на Заходнім фронце ў 1920 годзе, тав. Мельнікаў быў нагароджан орденам „Чырвонага сьцягу".

Кватэры для рабочых.

Белжылсаюз заканчвае пабудову 12-ці кватэрнага дому на рагу вуліц Нуроўскай і Маскоўскай. Засяленьне гэтага дому будзе прыстасавана да кастрычнікаўскіх урачыстасьцяў. Да гэтага часу будзе прыстасавана таксама засяленьне рабочымі яшчэ 14 кватэр у пасёлку „Камітэта" і ў жыльлёва-будаўнічых каапэратывах «Сувязь» і „Чыгуначнік".

Каніфольна-шпігінарны завод.

Сёлета ў БССР будзе прыступлена да пабудовы каніфольна-шпігінарнага заводу. Гэты завод будзе будавацца арцелямі Гомельскага акруговага саматужна-прамысловага саюзу.

Завод будзе выпрацоўваць каніфоль і серкавы шпігінар.

Подготовка да прыёму скаргаў на працаўнікоў міліцыі.

Адміністрацыйная Управа НКУС загадала ўсім адм. аддзелам АВК устанавіць дзяжурныя адказных працаўнікоў для прыёму скаргаў ад насельніцтва на няправільныя дзеньні працаўнікоў міліцыі. На дзяжурных укладаецца абавязак тэрмінова разглядаць скаргі і зараз-жа даваць адказы.

Захворваньні брушным тыфусам паменшыліся.

За апошні час эпідэмія брушнога тыфусу ў Менску зьменшылася. Так, за апошнія тры дні выпадкаў захворваньня зусім не было.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 29-VIII-1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—69, куп. 4—67.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—21,5 куп. 5—19,5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—0,4, куп. 5—02

Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 26,23, куп. 26—13.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 123, куп. 121.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 102—96, куп